Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 СНЕЖНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 242 (26355)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫМ ГОДЗЕ!

**Ідзе падпіска на I паўгоддзе і I квартал 2009 года**

**Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы | на 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 10120 | 30360 | 60720 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 9570 | 28710 | 57420 |
| 63858 (ведамасны) | 16170 | 48510 | 97020 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 14740 | 44220 | 88440 |

## Кіраўніцтва Беларусі і Расіі гатова да пошуку ўзаемавыгадных рашэнняў



Фота БЕЛТА.

**Беларусь і Расія з'яўляюцца стратэгічнымі і ключавымі адна для адной партнёрамі і гатовы да пошуку ўзаемапрымальных рашэнняў па актуальных пытаннях двухбаковага супрацоўніцтва. Гэту пазіцыю пацвердзілі Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў 22 снежня на перагаворах у Крамлі.**

Дамоўленасць аб сустрэчы была дасягнута ў пачатку снежня, калі было прынята рашэнне пачакаць з правядзеннем пасяджэння Вышэйшага Дзяржсавета. Дату і месца сустрэчы прапанаваў расійскі бок. У час нядаўняй тэлефоннай размовы Прэзідэнты агаварылі тэматыку і фармат маючай адбыцца сустрэчы. На ёй абмяркоўваліся пытанні цаны на прыродны газ ва ўвязцы з цэлым комплексам іншых пытанняў, у тым ліку эканамічных.

Кіраўнікі дзвюх дзяржаў выказалі ўзаемную думку аб тым, што гэты год быў няпросты, але цалкам рэзультатыўны для дзвюх краін.

«Мы сапраўды дабіліся ў эканамічнай сферы значных вынікаў, а ў іншых сферах наогул ніякіх праблем не было. У Расіі правільна падкрэсліваецца, што цяперашняя эканамічная сітуацыя створана не намі, яна прыўнесена і ў Беларусь, і ў Расію звонку. Калі б стабільнасць у свеце захоўвалася, нам было б дастаткова пяці гадоў (а Расіі можа менш) для таго, каб моцна стаць на ногі», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнты адзначылі, што цяперашняя складаная фінансава-эканамічная сітуацыя ў свеце аказала ўплыў на тэмпы эканамічнага развіцця. «Мы гэтага не ўтойваем. Але вельмі правільна канстатавалі і ў Еўропе, і ў ЗША, што паасобку з гэтага крызісу не выбрацца», — дадаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Нам сёння ёсць аб чым пагаварыць. Але публічна хачу адвесці ўсякія інсінуацыі, якія гучалі апошнім часам наконт таго, што Беларусь ледзь не на каленях ідзе ў Крэмль, каб нешта выпрасіць. Адразу хачу сказаць: мы сёння абсалютна нічога не збіраемся прасіць», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі ў пачатку сустрэчы ў вузкім складзе.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Беларусь — гэта зборачны цэх былога Савецкага Саюза, «а сёння, лічы, Расіі». «Камплектуючыя і рэсурсы мы купляем у Расійскай Федэрацыі. Калі эканоміка Беларусі спыніцца, вы цудоўна ведаеце, што гэта плюс 10 млн часткова або поўнасцю беспрацоўных у Расіі. Таму што спыняцца прадпрыемствы, у якіх мы бяром камплектуючыя. Лічу, гэта не ў інтарэсах Расіі, а тым больш Беларусі. Вось у гэтым ключы мы сапраўды хочам падтрымкі Расійскай Федэрацыі, таму што гэта ў інтарэсах і Расіі, і Беларусі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што Беларусь і Расія ў стане вырашыць пытанні, якія цікавяць адна адну.

«Што датычыцца пытанняў нашых перагавораў, тут, зразумела, журналісты маюць рацыю: не толькі ў нас ёсць да Расіі пытанні, але і ў Расійскай Федэрацыі — да Беларусі. Адразу хачу сказаць перад нашай размовай: мы не маем ніякіх праблем для таго, каб вырашыць усе пытанні Расіі так, як трэба, якія ляжаць у плоскасці Беларусі. І я думаю, што няма абсалютна ніякіх праблем, каб Расійская Федэрацыя вырашыла ўсе пытанні Беларусі, якія цікавяць тут нас. Я ўпэўнены, што мы ў стане іх вырашыць, таму што праблемных пытанняў, з нашага пункту гледжання, няма», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што Расія «заўсёды была зацікаўлена ў тым, каб Беларусі было добра і адносіны добра складваліся». «Расійская Федэрацыя для нас стратэгічны партнёр, і не проста стратэгічны — гэта брацкая дзяржава. Падабаецца гэта каму-небудзь або не, мы з гэтых пазіцый будзем зыходзіць заўсёды. Гэтак настроены беларускі народ. І вы выдатна ведаеце мой пункт погляду адносна Расійскай Федэрацыі», — дадаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Радавы тэрміновай службы Вадзім БАХАНЬКОЎ у свой вольны час на галоўным мінскім катку.*

## У СВЕЦЕ

### ЗУБКОЎ ПАПЯРЭДЗІЎ ЕЎРОПУ АБ ГАЗАВАЙ НЕБЯСПЕЦЫ З БОКУ УКРАІНЫ



**Расійская газавая манаполія «Газпрам» будзе выконваць усе абавязацельствы па кантрактах на пастаўку газу з еўрапейскімі партнёрамі, аднак дзеянні Украіны могуць дэстабілізаваць сітуацыю.**

Такая заява ўтрымліваецца ў пасланні кіраўніцтву Еўрасаюза і кіраўнікам урадаў асобных еўрапейскіх краін, якое падпісаў першы віцэ-прэм'ер і старшыня савета дырэктараў «Газпрама» Віктар Зубкоў.

Паводле інфармацыі расійскага боку, урад Расіі і «Газпрам» прымаюць усе намаганні для вырашэння праблемы з газавым доўгам Украіны, аднак рашэнне пакуль не знойдзена. Віктар Зубкоў адмыслова адзначыў, што прычына гэтага — «неканструктыўная пазіцыя ўкраінскага боку».

### КІРОЎЦА ЗБІЎ ТРАІХ У... ПАДЗЕМНЫМ ПЕРАХОДЗЕ

**Кіроўца пазадарожніка ва Украіне збіў траіх пешаходаў, аднаго з іх — насмерць, заехаўшы ў падземны пераход у горадзе Макееўка Данецкай вобласці.**

Як распавялі выратавальнікі, кіроўца аўтамабіля «Таёта-Лендкрузер» не справіўся з кіраваннем, заехаў у падземны пешаходны пераход, дзе збіў людзей. «Пасля гэтага ён заднім ходам выехаў з пераходу і дапусціў сутыкненне з пяццю легкавымі аўтамабілямі», — адзначылі ў МНС. У выніку ДТЗ пацярпелі чатыры чалавекі, у тым ліку кіроўца аўтамабіля і трое пешаходаў, адзін з якіх пазней сканаў у лякарні.

## «У АРТЫЛЕРЫІ — ВЫХАДНЫ!»

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.12.2008 г. (для б/н разлікаў) | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 200,00 |
| 1 еўра | 3 098,48 |
| 1 латвійскі лат | 4 376,80 |
| 1 літоўскі літ | 896,82 |
| 1 чэшская крона | 116,66 |
| 1 польскі злоты | 755,24 |
| 1 расійскі рубель | 77,83 |
| 1 украінская грыўня | 270,10 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 28,2682 |
| 10 UAH | 34,8131 |
| 1000 BYR | 12,8433 |
| EUR | 39,7253 |

| Курс у гандлёвых кампаніях (на 22.12.2008 г.) | |
|---|---|
| USD | 2250 / 2300 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.
ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Бернд ШТАНГЕ: Прамая лінія «Звязды»

## «У ФУТБОЛЕ ЗАЎСЁДЫ ЁСЦЬ ШАНЦ. У НАШЫМ ВЫПАДКУ — ШАНЦ АЎТСАЙДАРА»



**Канец снежня — самы час падвесці вынікі выступлення нацыянальнай каманды, якая пераадолела трэць адборачнага шляху на чэмпіянат свету-2010, правёўшы матчы з Украінай (0:1), Андорай (3:1) і Англіяй (1:3). А напрыканцы сезона была таварыская гульня на Кіпры, якую наша каманда насуперак спадзяванням крыўдна прайграла (1:2). На пытанні нашых чытачоў, што датычыліся нацыянальнай зборнай, выступлення БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў, а таксама іншыя, якія вы маглі задаваць папярэдне па тэлефоне або праз інтэрнэт, адказаў галоўны трэнер каманды Бернд Штанге.**

### АБ ЗБОРНАЙ:

***— Ці апраўдала зборная вашы спадзяванні?*** (**Андрэй Васільевіч,** *г. Маладзечна*)

— Яшчэ не. Мы павінны стаць нашмат мацнейшымі і перш за ўсё больш стабільнымі, асабліва ў афіцыйных сустрэчах. Добрых вынікаў у таварыскіх сустрэчах недастаткова. Мы павінны навучыцца менталітэту пераможцаў і дэманстраваць яго пастаянна — зноў і зноў.

***— Што было самым складаным у працы са зборнай і ў Беларусі ў цэлым?*** (**Дзяніс,** *Смаргонь*)

— Наданне зборнай новага аблічча і вывад маладых навічкоў на міжнародны ўзровень — працаёмкі працэс. Калі Глеб, Кутузаў ці Кульчы не могуць гуляць у тым ці іншым матчы, паўнавартаснай замены ім няма. І ў гэтым выпадку на полі мала гульцоў з лідарскімі якасцямі. Наш чэмпіянат рыхтуе пакуль недастатковую колькасць класных майстроў. І ў важным для нас узросце 25-30 гадоў не хапае гульцоў міжнароднага ўзроўню. Гэтую «шчыліну» мы закрываем зараз вялікай колькасцю моладзі. Даводзіць гэтых футбалістаў да патрэбнага ўзроўню — наша вялікая агульная задача.

***— Вы разрэкламавалі нацыянальную зборную як ніхто з вашых папярэднікаў. Гэта неад'емная частка трэнерскай справы ў Еўропе? А што самі лічыце самым важным у сваёй працы ў Беларусі?*** (***bigboss,*** *Мінск*)

— Прадукт пад назвай футбол паспяховы ва ўсім свеце. А нам у Беларусі патрэбна больш рэкламы. Дзве тысячы гледачоў на матчы вышэйшай лігі — дрэнны стымул для вялікіх дасягненняў. Мы ўсе павінны рабіць больш для балельшчыкаў, прычым газеты, тэлебачанне, радыё, спецыялісты па маркетынгу павінны таксама ўдзельнічаць у гэтым працэсе. Сёлета мы дасягнулі прагрэсу ў гэтым напрамку, аднак пакуль адстаём ад міжнародных стандартаў. Сваёй самай важнай задачай лічу дасягненне найлепшых вынікаў. Толькі яны маюць значэнне на гэтым узроўні, больш нічога.

**Прамую лінію правяла Алена АЎЧЫННІКАВА.**

*(Заканчэнне ў наступным нумары.)*

## Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Беларускага тэлеграфнага агенцтва з 90-годдзем з дня заснавання агенцтва

**Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што кожны дзень на працягу многіх дзесяцігоддзяў работнікі БЕЛТА прымаюць актыўны ўдзел у напісанні летапісу жыцця беларускага народа, садзейнічаюць умацаванню сацыяльна-палітычнай стабільнасці і маральных асноў грамадства.**

«Вядучае нацыянальнае агенцтва, плённа супрацоўнічаючы з замежнымі партнёрамі, павышае міжнародны аўтарытэт нашай краіны, забяспечвае правы грамадзян на атрыманне ўсебаковай інфармацыі аб найважнейшых падзеях у Беларусі і свеце», — гаворыцца ў віншаванні.

«Упэўнены, што супрацоўнікі агенцтва і надалей будуць уносіць дастойны ўклад у развіццё айчыннай прэсы і сусветнай інфармацыйнай прасторы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Налічаная сярэдняя зарплата работнікаў Беларусі ў лістападзе 2008 года склала Br954 тыс. 891

**паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Гэты паказчык у кастрычніку быў роўны Br958 тыс. 358.**

Налічаная сярэдняя зарплата рабочых і служачых у лістападзе склала Br972 тыс. 095. У кастрычніку яна была Br975 тыс. 418.

## У выхадныя істотна падмарозіць

**Аб гэтым паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.**

Сёння ўдзень ападкі будуць назірацца яшчэ ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Слабы туман, на ўсходзе краіны галалёд, на дарогах галалёдзіца. Чакаецца наліпанне мокрага снегу. Тэмпература паветра ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. У сераду і чацвер амаль усюды будзе ісці снег, слабая мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. У сераду на працягу сутак 1—7, у чацвер — 3—9 градусаў марозу, уначы ў пятніцу 4—10, удзень — 3—8 марозу. У выхадныя сціхне вецер, спыніцца снег, але ўзмоцняцца маразы. У суботу—нядзелю ўначы мінус 6—11, пры праясненнях да 14, удзень мінус 3—9 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ISSN 1990 - 763X

## ЖЫВАЯ ХРОНІКА

### *Найстарэйшае інфармацыйнае агенцтва краіны — БелТА — сёння спраўляе 90-годдзе*

**Яго вялікасці Факту верай і праўдай служыла не адно пакаленне белтаўцаў. Хвіліна за хвілінай, год за годам яны вялі хроніку краіны. Вачыма фотакораў і журналістаў мы і зараз можам пабачыць тагачаснае жыццё, пагартаўшы старыя падшыўкі. Сёння БелТА выпускае прыблізна паўтары сотні паведамленняў і сто фотанавінаў з усіх куткоў краіны штодзень. Акрамя агенцтва ў структуры медыя-асілка яшчэ штотыднёвая газета «7 дзён», часопісы «Эканоміка Беларусі» і «Беларуская думка». Плюс выдавецкая дзейнасць, а таксама стварэнне сайтаў. БелТА зрабіла сабе імя і ў дадатковых рэкамендацыях не мае патрэбы. Іншымі сталі маштабы працы, аднак нязменным застаўся прынцып. Хроніка як яна ёсць. Не ўчора, не заўтра, а менавіта сёння, літаральна зараз.**



### БЕЛТАЎЦЫ

Першае, што бачыць наведвальнік, трапляючы ў працоўны кабінет **генеральнага дырэктара БелТА Дзмітрыя ЖУКА** — выслоўе Чэ Гевары на дзвярах «Стаміўся — адпачні. Але пасля гэтага ты ніколі не будзеш байцом рэвалюцыі». Дык вось які падыход да працы ў агенцтве?

— Калі ты працуеш з інфармацыяй, і ўпусціў хоць нешта, расслабіўся на момант, то ўзнавіць ланцуг падзей практычна немагчыма. Вось гэта, напэўна, галоўнае ў рабоце рэпарцёра — ён павінен быць пастаянна ў курсе ўсіх падзей, — упэўнены спадар Жук, які сам пакаштаваў рэпарцёрскага хлеба. — Работа ў інфармагенцтве дыктуе прэтэндэнту шэраг умоў. Па-першае, гэта павінен быць чалавек усебакова адукаваны. Па-другое, мецць выразнае мысленне і вылучаць галоўнае ў падзеі, яе сутнасць. І потым гэта лаканічна і выразна перадаваць — так, каб дадатковых пытанняў у тых, хто спажывае інфармацыю, не ўзнікала. Па-трэцяе, валодаць прафесійнай сумленнасцю. Ён не мае права выказваць сваё стаўленне да падзеі, калі рыхтуе паведамленне, — толькі яе ўдзельнікаў ці аўтарытэтных у гэтай сферы спецыялістаў. Аднак гэта зусім не азначае, што журналісты БелТА не маюць свайго меркавання. Для гэтага ёсць шмат іншых жанраў. Тыя ж каментарыі, якія робяць журналісты для ленты, акрамя таго, мы выдаём газету, часопісы, таму спектр прымянення іх творчасці вельмі шырокі і аналітыкі таксама хапае. Па-чацвёртае, трэба, каб чалавек быў псіхалагічна гатовы да працы ў нас.

Персанал, прызнаецца кіраўнік, падабраць цяжка. Таму многіх спецыялістаў БелТА рыхтуе сваімі сіламі:

— Каб да нас трапіць, нельга прыйсці на пятым курсе і сказаць «Я хачу працаваць у вас». Мы вядзём 7 — 10 журналістаў пачынаючы з другога курса, гады праз два-тры разумеем, каго з іх хацелі б бачыць у сябе, і тады яны працуюць у нас на палову стаўкі. Фактычна яны праходзяць тут яшчэ і вытворчае навучанне, як гэта раней называлася. На жаль, выпускнікі Інстытута журналістыкі слаба ведаюць асновы дзяржаўнага ладу, нацыянальнай эканомікі. 98 са 100 выпускнікоў, якія прыходзяць да нас, хочуць пісаць пра культуру... Таму апошнім часам мы сталі аддаваць перавагу выпускнікам факультэта міжнародных адносінаў, маладым эканамістам. Шмат набіраем праграмістаў, бо актыўна развіваемся ў інтэрнэце. Сярэдні ўзрост працаўнікоў агенцтва — 37 гадоў.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*



# Кіраўніцтва Беларусі і Расіі гатова да пошуку ўзаемавыгадных рашэнняў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў заявіў: «Тут у нас пункты гледжання супадаюць. Мы, зразумела, лічым Беларусь сваім ключавым, стратэгічным партнёрам. І ў гэтай канстатацыі ўсё закладзена. У супрацоўніцтве дзяржаў, нават такіх блізкіх, як Беларусь і Расія, усё роўна будуць накопліваацца пытанні. Мы для таго і сустракаемся, каб іх здымаць. Гэта наш канстытуцыйны абавязак як прэзідэнтаў: сустрэліся, абмеркавалі, прынялі рашэнне — узаемавыгаднае, якое ўспрымаецца нашымі народамі. Я з гэтага буду зыходзіць».

Дзмітрый Мядзведзеў дадаў, што ў канцы года «прынята сустракацца, падводзіць вынікі, як гэта робіцца ў добрых сяброў». «Таму і мы з вамі можам сёння абмеркаваць, як прайшоў гэты год», — падкрэсліў Дзмітрый Мядзведзеў, звяртаючыся да Аляксандра Лукашэнкі.

На думку Прэзідэнта Расіі, 2008 год быў «вельмі насычаны, у нечым складаны». «У той жа час калі гаварыць аб дынаміцы беларуска-расійскага супрацоўніцтва, то яна была нядрэнная. Устойліва рос тавараабарот. Мы, у прынцыпе, выходзілі на тыя рашэнні, на якія павінны былі выходзіць. З улікам сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу мы прадаўжаем супрацоўнічаць, знаходзіць шляхі выхаду з гэтых праблем. Лічу, што Новы год на расійска-беларускім напрамку мы можам сустракаць з добрым настроем», — сказаў Дзмітрый Мядзведзеў.

Пасля заканчэння сустрэчы ў вузкім фармаце Прэзідэнты Беларусі і Расіі прадоўжылі перагаворы ў пашыраным складзе: да кіраўнікоў дзяржаў далучыліся прэм'ер-міністры дзвюх краін Сяргей Сідорскі і Уладзімір Пуцін, а таксама кіраўнікі Нацыянальнага банка Беларусі і Цэнтрабанка Расіі. Затым у Крамлі прайшло рабочае снеданне Прэзідэнтаў, у якім прынялі ўдзел кіраўнікі ўрадаў.

Па выніках прайшоўшых перагавораў была вызначана цалкам прымальная для беларускага боку цана на газ. Былі прынятыя рашэнні абмеркаваных пытанняў, у тым ліку ў сферы бяспекі, якія атрымаюць сваё дакументальнае афармленне на запланаваным на канец студзеня 2009 года пасяджэнні Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы. Парадак дня ВДС прапанаваны беларускім бокам.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Дзяржаўная камісія выбрала для будаўніцтва беларускай АЭС Астравецкую пляцоўку

Атамная электрастанцыя ў Беларусі будзе будавацца на Астравецкай пляцоўцы ў Гродзенскай вобласці. Такое рашэнне прыняла 20 снежня Дзяржаўная камісія па выбары месца размяшчэння зямельнага ўчастка для будаўніцтва АЭС Беларусі, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА прэс-сакратар Міністэрства энергетыкі Беларусі Людміла Зяньковіч. Гэты выбар зроблены па выніках вывучэння трох пляцовак — Астравецкай, Краснапалянскай і Кукшынаўскай. Беларусь плануе ўвесці ў эксплуатацыю два блокі АЭС магутнасцю 1 тыс. МВт кожны. Першы блок павінен быць уведзены ў 2016 годзе, другі — у 2018 годзе.

# Расіяне лічаць Беларусь самай стабільнай і паспяховай па развіцці краінай у СНД

**Аб гэтым сведчаць вынікі апытання, праведзенага Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Згодна з даследаваннем, стабільнай і паспяховай у плане развіцця краінай лічаць Беларусь 51 працэнт расіян. Другое месца ў апытаных заняў Казахстан — 40 працэнтаў. На трэцім месцы з вялікім адрывам ад лідараў знаходзіцца Азербайджан. Яго развіццё палічылі паспяховым і стабільным 11 працэнтаў рэспандэнтаў. Астатнія краіны СНД набралі не больш як 9 працэнтаў, а замыкаюць спіс Таджыкістан і Грузія, набраўшы 3 працэнты і 1 працэнт адпаведна. У рэйтынгу даверу расіян лідарам краін СНД першую пазіцыю таксама заняла Беларусь: Аляксандру Лукашэнку давяраюць 44 працэнты расіян. Прэзідэнту Казахстана Нурсултану Назарбаеву — 35 працэнтаў. У рэйтынгу даверу трэцяе месца заняў з істотным адставаннем ад лідараў Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў — 7 працэнтаў.

# Свята Цуду

**Першую Ханукальную свечку ў 2008 годзе яўрэі запалілі пасля заходу сонца 21 снежня, а свята Ханука працягнецца да 29 снежня.**

Свята гэта было ўсталявана ў памяць аб падзеі, якой больш за 2 тысячы гадоў. Назва яго перакладаецца як «свята агнёў». Ханука сімвалізуе адраджэнне яўрэйскага духоўнага і культурнага жыцця. У 198 г. да нашай эры Іудзея аказалася ў руках Селеўкідаў (асірыйскіх грэкаў). Спачатку жыццё яўрэйскага народа часткова нават палепшылася. Але потым уступіў у сілу закон, які забараняў пад страхам смяротнага пакарання вывучаць Тору, святкаваць Суботу (Шабат) і весці адлік дзён па яўрэйскім календары. Яўрэйскі народ у 164 годзе да нашай эры ўзняўся на паўстанне. Падняўшыся на храмавую гару, паўстанцы знайшлі ў Храме алей для лампад, у колькасці, якая была дастатковай для падтрымання агню на працягу толькі аднаго дня. Але тут адбыўся цуд: свяцільня гарэла роўна восем дзён — менавіта столькі, колькі было неабходна, каб зрабіць новы алей.

Згадваючы гэты цуд, яўрэі кожны год роўна восем дзён святкуюць Хануку. Яны кажуць: «Няшмат святла дастаткова для таго, каб рассеяць вялікую цемру».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Хто павінен падаваць падатковую дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе

**Адразу трэба нагадаць, што, згодна з Законам РБ «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў», сёлета даходы, атрыманыя фізічнымі асобамі не па месцы асноўнай працы, абкладаюцца падаходным падаткам па стаўцы 15 працэнтаў і не падлягаюць дэклараванню.**

Разам з тым, у пачатку наступнага года **шэраг фізічных асобаў павінны падаць падатковую дэкларацыю** ў тым выпадку, калі яны атрымлівалі даходы ад фізічных асобаў, якія не з'яўляюцца падатковымі агентамі. У гэтым выпадку дэклараванню падлягаюць даходы ад платнага адчужэння (у тым ліку шляхам продажу, мены, рэнты) на працягу 5 гадоў больш як аднаго кватэры, дачы, садовага доміка з гаспадарчымі пабудовамі, гаража і аднаго зямельнага ўчастка, калі гэтая нерухомасць належыць фізічным асобам на праве ўласнасці; даходы, атрыманыя ад продажу, мены ці рэнты на працягу года больш як аднаго аўтамабіля ці іншага транспартнага сродку; даходы, атрыманыя ад платнага адчужэння аб'ектаў нерухомай маёмасці, што адносяцца да нежылых памяшканняў. Дэклараваць трэба таксама даходы, якія атрымлівалі фізічныя асобы ад платнага адчужэння каштоўных папер і фінансавых інструментаў тэрміновага рынку, уключна даходы ад рэалізацыі імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» і «Маёмасць», даходы ад платнага адчужэння доляў арганізацый у статутным фондзе арганізацый; даход ад платнага адчужэння аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці; даходы ад платнага адчужэння маёмасці, якая раней выкарыстоўвалася ў прадпрымальніцкай дзейнасці ў якасці асноўных сродкаў для вытворчасці тавараў, выканання работ, паслуг і інш.

Падатковую дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе павінны падаваць і тыя плацельшчыкі, якія атрымлівалі сёлета даходы з крыніц за межамі Беларусі, а таксама калі такія фізічныя асобы з'яўляюцца падатковымі рэзідэнтамі нашай краіны. Да такіх даходаў адносяцца грашовыя сродкі, атрыманыя за мяжой ці з-за мяжы, у тым ліку пры дапамозе банкаўскіх пераводаў, паштовых адпраўленняў і інш.

**Як удакладнілі рэдакцыі ў прэс-цэнтры Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь,** фізічныя асобы, якія не прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі нашай краіны, бо знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі менш як 183 дні ў годзе, вызваляюцца ад падачы ў падатковы орган дэкларацыі аб сукупным гадавым даходзе за гэты год.

Падатковую дэкларацыю па выніках года павінны падаць у падатковую інспекцыю і тыя грамадзяне, якія атрымлівалі іншыя даходы, па якіх вылік падатку не ўскладзены на падатковых агентаў. Да такіх даходаў можна аднесці сумы, якія атрыманыя ў якасці кампенсацыі маральнай шкоды фізічнымі асобамі па рашэнні суда шляхам выдачы такіх сродкаў з дэпазітнага рахунку адпаведнага раённага (гарадскога), абласнога, Мінскага гарадскога суда.

Акрамя гэтага, фізічныя асобы могуць падаць падатковую дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе за 2008 год, калі на працягу года яны мелі права, аднак не скарысталіся ці скарысталіся не ў поўным аб'ёме стандартнымі, сацыяльнымі, маёмаснымі падатковымі вылікамі і (або) маюць права на атрыманне прафесійнага падатковага выліку.

Асобна трэба адзначыць тое, што ў 2009 годзе плацельшчыкі могуць падаць падатковую дэкларацыю за тры мінулыя гады (2008, 2007 і 2006), па якіх падатковым органам будзе ажыццяўляцца пераразлік падатковага падатку.

Вяртанне залішне выплачанай сумы падаходнага падатку ажыццяўляецца на працягу аднаго месяца пасля дня падачы фізічнай асобай заявы аб вяртанні падатку.

Бланкі падатковых дэкларацый набываюцца падаткаплацельшчыкамі самастойна. Такія бланкі будуць прадавацца ў спецыялізаваных крамах і кіёсках, у тым ліку непасрэдна ў інспекцыях Міністэрства па падатках і зборах (адрасы апошніх можна ўдакладніць у падатковых інспекцыях па месцы пастаноўкі на ўлік). Фізічныя асобы могуць падаваць у падатковую інспекцыю запоўненую дэкларацыю, форму якой можна набыць на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь www.nalog.by ці вывесці яе з прававой базы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**СТАЎКІ ПАДАХОДНАГА ПАДАТКУ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПРЫ ВЫЛІЧЭННІ ПАДАХОДНАГА ПАДАТКУ З СУКУПНАГА ГАДАВОГА ДАХОДУ ЗА 2008 Г.**

| Памер падатковай базы за падатковы перыяд | Падатковыя стаўкі (сумы) падатку |
|---|---|
| да 8 400 000 | 9 працэнтаў |
| ад 8 400 001 рубля да 21 000 000 рублёў | 756 000 рублёў + 15 працэнтаў з сумы, якая перавышае 8 400 000 рублёў |
| ад 21 000 001 рубля да 29 400 000 рублёў | 2 646 000 рублёў + 20 працэнтаў з сумы, якая перавышае 21 000 000 рублёў |
| ад 29 400 001 рубля да 37 800 000 рублёў | 4 326 000 рублёў + 25 працэнтаў з сумы, якая перавышае 29 400 000 рублёў |
| ад 37 800 001 рубля і вышэй | 6 426 000 рублёў + 30 працэнтаў з сумы, якая перавышае 37 800 000 рублёў |

# ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ З БЕЛАГРАПРАМБАНКАМ

Арыгінальны падарунак

**Снежаньскія імяніннікі — удзельнікі дзіцячай ашчаднай праграмы «Расці вялікі!» ААТ «Белаграпрамбанк» — атрымалі прыемны сюрпрыз. Дарэчы, малыя кліенты банка штогод атрымліваюць на свой дзень нараджэння арыгінальны падарунак.**



70 мінчан ва ўзросце да 16 гадоў былі запрошаны на канцэртную праграму дзіцячага музычнага конкурсу «Гукі школ», які прайшоў у клубе «Арыён». Падчас уручэння падарункаў да дня нараджэння супрацоўнікі Белаграпрамбанка падзякавалі за супрацоўніцтва кожнага з юных кліентаў. Запамінальнае канцэртнае шоу дзецям падарылі таленавітыя фіналісты музычнага праекта «Гукі школ», гастрольны тур якога праходзіць па гарадах краіны з кастрычніка. Вядучая праграмы фіналістка міжнароднай «Фабрыкі зорак» у Латвіі, пераможца тэлеконкурсу «Хіт-момант» Мілана Маральна падтрымлівала як выканаўцаў, так і імяніннікаў. Гледачы пабачылі выступленні ансамбля «Верасяты», пераможцы міжнароднага конкурсу «Славянскі базар у Віцебску», уладальніка Гран-пры многіх рэспубліканскіх і міжнародных вакальных конкурсаў Міхаіла Лілы, а таксама трыумфатара «Дзіцячага Еўрабачання-2007» Аляксея Жыгалковіча.

Дарэчы, наперадзе ў выканаўцаў яшчэ шмат выступленняў і глядацкай удзячнасці — канцэртны тур «Гукі школ» па гарадах Беларусі завершыцца ў наступным годзе. Арганізатары тура — прадзюсарскі цэнтр «Нонстопрэкардс» і ААТ «Белаграпрамбанк» падораць жыхарам Віцебска, Магілёва, Баранавічаў, Оршы, Гродна, Гомеля, Барысава і іншых гарадоў сапраўднае свята дзіцячай песні!

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

ЖАХ

## ЗАМЕСТ ТРУНЫ — МЕХ, І ЎНАЧЫ Ў АПОШНІ ШЛЯХ

20 снежня ў Магілёве каля 5 гадзін раніцы чалавек патэлефанаваў у міліцыю і паведаміў, што толькі што бачыў, як мужчына цягне па праезнай часці абвязаны вяроўкамі мех. Прычым у мяху, як падалося сведку, угадваліся абрысы чалавечага цела.

На месца здарэння адразу выехаў нарад аховы. І сапраўды: 52-гадовы мужчына цягнуў труп. Цела 50-гадовага інваліда не мела адбіткаў гвалтоўнай смерці. Экспертыза пазней выявіла, што чалавек памёр у выніку пнеўманіі.

Мужчына, якога затрымалі з мехам, патлумачыў, што ішоў на могілкі, дзе хацеў без лішніх выдаткаў пахаваць цела памерлага, які апошнім часам жыў у яго доме. У доказ гэтага сцвярджэння паказаў рыдлёўку. Сам чалавек нідзе не працуе, таму такую «эканомію» палічыў даравальнай. Міліцыя праводзіць праверку гэтага здарэння.

**Алена КАЗЛОВА.**

## НЕБЯСПЕЧНЫЯ ТРАТУАРЫ

У непагадзь і на тратуарах пешаходам трэба быць уважлівымі і асцярожнымі. Увечары 20 снежня ў Асіповічах 31-гадовы жыхар райцэнтра, які кіраваў аўтамабілем «Фольксваген-Пасат», не зрэагаваў на неспрыяльныя ўмовы надвор'я, не справіўся з кіраваннем, выехаў з праезнай часткі на абочыну і наехаў на двух пешаходаў. Жанчына 55-ці гадоў і 56-гадовы мужчына стаялі на тратуары пад ліхтаром. Яны атрымалі раненні, ад якіх праз лічаныя гадзіны памерлі ў бальніцы. Вадзіцель аўтамабіля, дарэчы, яшчэ летась быў пазбаўлены правоў у сувязі з кіраваннем у нецвярозым стане.

**Алена КАЗЛОВА.**

# Брэсцкія лаўрэаты ў галіне якасці

**Дзясятая цырымонія ўзнагароджання лепшых прадпрыемстваў вобласці ў галіне якасці адбылася ў Брэсцкім аблвыканкаме. Сёлета ў конкурсе ўзялі ўдзел 26 прадпрыемстваў, з якіх 6 сталі лаўрэатамі і 11 пацвердзілі гэта званне.**

Усяго за дзесяць гадоў у конкурсе ўдзельнічалі звыш 150 прадпрыемстваў, лаўрэатамі сталі 40 прадпрыемстваў, з іх 12 пацвердзілі гэта званне двойчы, 8 — тройчы і 3 — чатыры разы. 24 прадпрыемствы атрымалі прэміі Урада. Сярод лаўрэатаў конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» — 76 прадпрыемстваў вобласці. Прадукцыя 31 прадпрыемства-лаўрэата вобласці вызначана лепшай на рынку Расійскай Федэрацыі і размешчана ў каталогі праграмы «100 лепшых тавараў Расіі».

Сёлета прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці атрымалі ААТ «Белавежскі» і ВРУП «Брэстаблгаз». Званне дыпламанта — у ААТ «Жабінкаўскі камбікормавы завод». Лаўрэатамі конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі» названы 8 абласных прадпрыемстваў. 44 прадпрыемствы з'яўляюцца лаўрэатамі конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь». У гэтай намінацыі, дарэчы, Брэсцкая вобласць лідзіруе сярод іншых рэгіёнаў. Званне «Лепшы менеджар па якасці» заваявала Галіна Цітова, галоўны спецыяліст па менеджменту — начальнік аддзела сістэм менеджменту РУП «Баранавіцкі аўтаагрэгатны завод». Уладальнікамі нагруднага знака «Лідар якасці» за асабісты ўнёсак у дасягненне найвышэйшых вынікаў у галіне якасці прадукцыі, паслуг і сістэмнага менеджменту сталі дырэктар ПУМП «КОМПО» Міхаіл Белавусаў і генеральны дырэктар ААТ «Савушкін прадукт» Аляксандр Саўчыц.

**Кар. «Звязды».**


## Абзац

**■ Елачныя базары будуць працаваць у Мінску з 24 па 31 снежня з 10.30 да 19.30 без выхадных і святочных дзён.**

■ Мабільныя групы па выяўленні фактаў рэалізацыі піратэхнічных вырабаў дзяжураць у перадсвяточныя дні ва ўсіх раёнах Мінска. Толькі на працягу трох апошніх дзён канфіскавана больш за 11 тыс. адзінак піратэхнікі.

**■ Беларуска-расійскае прадпрыемства па вырошчванні вугра будзе пабудаванае ў Калінінградскай вобласці. Магутнасць прадпрыемства складзе 50 тон вугра і 1,25 млн яго малька ў год. Кошт праекта ацэньваецца ў 93 млн. расійскіх рублёў. Заканчэнне будаўніцтва прызначана на 2011 год. Беларускі бок атрымаў таксама прапанову накіраваць студэнтаў для ўдзелу ў кругасветнай экспедыцыі парусніка «Крузенштэрн».**

■ Пажар у Рэчыцкім раёне адабраў жыццё ў маладой маці і яе двухгадовага сына. З ахопленай полымем кватэры супрацоўнікам МНС удалося выратаваць 28-гадовага мужчыну і дзяўчынку 2003 г.н. Мяркуемай прычынай пажару з'яўляецца неасцярожнае абыходжанне з агнём.

**■ Папулярны сярод польскіх і замежных турыстаў гарналыжны курорт Закапанэ увёў на перыяд калядных і навагодніх святаў уласную валюту. Закапанскім фунтам можна разлічвацца ў большасці гарадскіх рэстаранаў, звычайных і сувенірных крамаў. Фунт уяўляе з сябе біметалічную манету, якая, па меркаванні гарадскіх улад, да ўсяго можа карыстацца попытам у нумізматаў. На аверсе манеты змешчана выява бацькі польскай незалежнасці Юзафа Пілсудскага, на рэверсе — пісьменніка Стэфана Жаромскага. Курс аднаго закапанскага фунта складае 10 злотых (каля 2,5 еўра). Валюта курорта будзе знаходзіцца ў абарачэнні да 4 студзеня 2009 года.**

■ Хірургі лякарні ў штаце Каларада (ЗША), якія рабілі аперацыю па выдаленні пухліны з галаўнога мозгу нованароджанага, са здзіўленнем выявілі, што гэта зусім не пухліна, а маленькая ступня. Аперацыя рабілася на трэці дзень пасля нараджэння немаўляці. Пухліна выявілася падчас магніта-рэзананснай тамаграфіі. Пры аперацыі акрамя добра сфарміраванай ступні, з галавы дзіцяці былі выдаленыя таксама фрагменты рукі і сцягна. Дактары патлумачылі, што назіралі рэдкую паталогію — развіццё плода ўнутры плода. Брат-блізня замест таго, каб развівацца побач з Сэмам, пачаў расці ў яго мозгу. У медыцыне апісана не больш за 100 такіх выпадкаў.


## Поўны абзац

**■ Улады італьянскага Мілана заявілі, што канфіскаваныя мытнікамі 40 кг чорнай ікры будуць раздадзеныя гарадской беднаце ў якасці навагодніх падарункаў. Кошт кантрабанднай бялужынай ікры, што прызначалася для продажу на чорным рынку ў Венецыі, Мілане і Монтэ-Карла, складае больш за паўмільёна долараў. Ідэя накіраваць далікатэс у дабрачынныя сталоўкі, кухні і прытулкі для бяздомных належыць Джуры Мантэгаца — супрацоўніку аддзела па ахове лясоў і жывёлаў, якія знікаюць. «Я падумаў, што ікру трэба аддаць бедным, таму што ў мінулым годзе падчас аналагічнай аперацыі яе проста знішчылі», — сказаў ён. Сярэдняя порцыя ікры для бедных складзе прыкладна 120 г — ад двух да чатырох разоў больш, чым падаюць на порцыю ў дарагіх рэстаранах. Таксама жабракам пададуць поліўку з чачавіцы і пасту.**

■ Жыхар штата Індыяна (ЗША) заплаціў падатак на нерухомасць у суме $21 тыс. манетамі. Гэта быў пратэст супраць высокіх падаткаў, якія плаціць домаўладальнік. Мужчына прывёз бухгалтарам смеццевае вядро з доларавымі манетамі вагой у 182 кг. Разам з манетамі ён прынёс плакат «Падаткі на ўласнасць зашкальваюць!» За 2 гады падаткі павялічыліся на 48 %. Калі яны не знізяцца, пратэстант паабяцаў заплаціць іх у наступным годзе 10-цэнтавымі манетамі.


**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенных в доход государства: **Лот № 1:** *швейный цех (2-этажное кирпичное здание), об. пл. 394,2 кв.м,* расположенного: Слуцкий район, д. Греск, ул. Минская, д. 1. Начальная цена – 66 150 000 бел. рублей (снижена на 10 %). **Лот № 2:** *торговый павильон (магазин № 63), об. пл. 118,7 кв.м*, расположенного: г. Слуцк, ул. Ленина, 284. Начальная цена – 53 000 000 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.10.2008 г. Аукцион состоится **20.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.01.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

**Страховой полис** обязательного страхования ответственности владельцев транспортных средств на территории стран—членов системы «Зеленая карта» **серии BY/12 № 1893730** СООО «Белкоопстрах» **считать недействительным.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже однокомнатной квартиры (общ. пл. 37,30 кв.м), расположенной: г. Минск, ул. Полиграфическая, д. 6, кв. 25. Начальная цена – 75 000 долларов США. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется в бел. руб. по курсу НБ РБ на день оплаты на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, которые постоянно проживают в г. Минске, и юридические лица, зарегистрированные на его территории. Оплата за объект производится в течение 30 дней с даты проведения торгов. Договор купли-продажи заключается в течение 5 рабочих дней после полной оплаты. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **27.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.01.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактные телефоны: (8017) 2246134, (801776) 44616. Сайт в интернете: www.rlt.by**

УНП 690324015.

**По поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Первомайского района г. Минска, КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже конфискованного гаража № 401, об. пл. 18 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 165, ГК «Клаксон» (3-й этаж, отопление, свет). Начальная цена – 21 266 000 бел. рублей. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **27.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.01.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактный телефон (8017) 2246134. Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

ЗАСО «Промтрансинвест» просит **считать недействительными** утерянные страховые полисы СК «Мегаросс-Д» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РФ серии ААА № 0251155815, № 0283256612, № 0283256613, № 0283269881, № 0283269924, № 0283269928, № 0283269931, № 0283287354, № 0283287357, № 0283287449, № 0297087277, № 0297087421, № 0400221079, № 0400221181, № 0400233593, № 0400233597, № 0400233604, № 0400233607, № 0400233645, № 0400233699, № 0400233748, № 0400233756, № 0401944170, № 0401944194, № 0401944290, № 0401944293, № 0401944325, № 0401944357, № 0401944478, № 0401944513, № 0401944526, № 0401944531, № 0401944578, № 0401944583, № 0401944593, № 0401944605, № 0401944606, № 0425868008, № 0439137282, № 0451957647.


# ЖЫВАЯ ХРОНІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ЭПАХАЛЬНЫЯ ПАДЗЕІ

Найстарэйшая інфармацыйная служба і дзяржава — аднагодкі. Першая нават узнікла сямю днямі раней. Таму вехі яе гісторыі — гэта цэлая эпоха.

— Бюро БелРасТА (Расійскага тэлеграфнага агенцтва) было адкрыта за тыдзень да стварэння БССР. Многія гісторыкі мяркуюць, што якраз-такі з мэтай асвятлення менавіта гэтай падзеі, — распавядае малады гендырэктар БелТА, які займае сваю пасаду пяць гадоў. — Далей гэта, безумоўна, гады грамадзянскай вайны, а пасля гады аднаўлення, будаўніцтва. Тады выкарыстоўваліся разнастайныя формы, вельмі далёкія ад тых, што мы сёння бачым — гэта і плакаты, і тэлеграмы, нават агітканцэрты, выступленні перад калектывамі. Найбольш актыўным, напэўна, у той час было Віцебскае аддзяленне. Магчыма, таму што ўсё ж такі частка тэрыторыі Беларусі была акупавана. А можа з-за крэатыўнасці, як цяпер прынята казаць, яго кіраўніцтва. Адным з супрацоўнікаў — спадаром Мерніным — у 1921 годзе былі выведзены вельмі цікавыя запаведзі журналіста, актуальныя і сёння. Вось напрыклад «Не пішы ні аднаго такога артыкула, прачытаць які ў цябе самога не хапіла б цярпення» — грашым гэтым, праўда? Калі казаць пра сутнасць журналісцкай працы ці пра тыя задачы, якія ставіліся на зары стварэння інфармацыйнай службы Беларусі, яны ў прынцыпе засталіся нязменнымі. Хутка, выразна, праўдзіва інфармаваць насельніцтва краіны і сусветную супольнасць аб рашэннях улады, падзеях, якія адбываюцца ў дзяржаве.

І праўдзівасць пры гэтым не прыносіцца ў ахвяру аператыўнасці. Белтаўцы ведаюць кошт памылкі і выразна ўсведамляюць розніцу паміж «даведацца першым» і «даведацца напэўна».

— У Беларусі зарэгістравана дзевяць інфармагенцтваў, так што канкурэнцыя ёсць. Той, хто кажа другім, ужо апраўдваецца. На жаль, гэтага не разумеюць многія нашы дзяржаўныя чыноўнікі. У выніку яны самі апраўдваюцца і вымушаюць за сябе апраўдвацца журналістаў. Зразумець, што заявіць першым сваю пазіцыю — гэта не дрэнна, а наадварот, выйгрышна, сёння нямногія здольныя. Хоць ёсць і прыемныя выключэнні. Мы імкнёмся апярэдзіць канкурэнтаў, але і даражым сваім імем — даём толькі правераную і дакладную інфармацыю. Таму БелТА сёння мае аўтарытэт і немалую нішу на рынку. У нашых паведамленнях вы не сустрэнеце «крыніц з блізкага акружэння палітыка» або «дзеяча, які пажадаў застацца неназваным». Сёння да нас вяртаюцца многія кліенты, якіх мы страцілі са з'яўленнем інтэрнэту, калі інфармацыя стала даступнай (такі адток адчулі тады ўсе інфармагенцтвы). Проста яны зразумелі, што для прыняцця рашэнняў патрэбна дакладная, праўдзівая інфармацыя. А тое, што прапануе сёння інтэрнэт, не заўсёды адпавядае рэчаіснасці. Калі мы прыходзім у краму, то ўзяўшы ў рукі тавар, даведваемся пра яго вытворцу, тэрмін прыдатнасці і гэтак далей. Чаму тады мы такія бесклапотныя ў тым, што датычыцца інфармацыі? Калі на сайце вы не ўбачылі, хто з вамі кантактуе па той бок манітора, варта крытычна ставіцца да напісанага і не ўсё прымаць на веру.

У Дзмітрыя Жука на гэты конт даволі катэгарычныя погляды. У свой час ён нават прапаноўваў стварыць нешта накшталт Асацыяцыі адказных інтэрнэт-выдаўцоў, якія бралі б на сябе пэўныя абавязкі ў плане прадастаўлення інфармацыі і маглі б карыстацца адмысловым лагатыпам аб'яднання — гэткім знакам якасці. Як сустрэлі ініцыятыву калегі?

— Яна, безумоўна, знайшла водгук — розны... Тым не менш, сур'ёзныя інтэрнэт-выдаўцы падтрымалі гэту ідэю. Аднак у хуткім часе ўступіць у сілу новая рэдакцыя закона аб СМІ, там у прыватнасці рэгламентавана работа інтэрнэт-версій традыцыйных мас-медыя. Таму больш правільна будзе паглядзець, як стане развівацца сітуацыя ў сувязі з гэтым. Пасля таго, як мы ўбачым, як аформілася інфармацыйнае інтэрнэт-поле, можна будзе меркаваць, як арганізоўваць асацыяцыю.

Ну а пакуль медыйны знак якасці не распрацаваны, БелТА можа пахваліцца шмат якімі іншымі знакамі адрознення: у яго скарбонцы — безліч узнагарод, у тым ліку нязменная «Залатая ліцера», а таксама Спецыяльная прэмія Прэзідэнта за серыю плакатаў «За Беларусь!». Так-так, маляўнічыя вывы, знаёмыя кожнаму гараджаніну — таксама «справа рук» БелТА.

— Мы вярнуліся крыху да сваіх традыцый — тых «Вокнаў РасТА», дзе былі плакаты. Над гэтым праектам працаваў цэлы калектыў — мастакі, фатографы, рэдактары. Тут праявіўся, як ні ў якіх іншых момантах, карпаратыўны дух, работа на адзіную мэту. Ну і для мяне асабіста ў гэтым праекце прыемна тое, што ўсе плакаты пазітыўныя. На жаль, сёння гэтага ў нашым жыцці вельмі нестае. І гэта праца не спыняецца, плакаты «Мы — беларусы» і многія іншыя — усё гэта выходзіць з творчай майстэрні БелТА.

### АДНОЙ НАГОЙ У БУДУЧЫНІ

Сказаць, што інтэрнэт развіваецца вельмі імкліва, — фактычна прамаўчаць. Здаецца, навінку яшчэ не паспелі прыдумаць, як яна ўжо састарэла. Такія яны, высокія тэхналогіі. І ў беларускім медыйным полі гульцоў становіцца ўсё больш. Як не згубіць і не згубіцца ў канкурэнтнай барацьбе? Ці плануе кампанія, у складзе якой сёння не адзін сродак масавай інфармацыі, выходзіць яшчэ і на рынак аўдыёвізуальных медыя?

— У першую чаргу БелТА — гэта інфармацыйнае агенцтва, — падкрэслівае Дзмітрый Жук. — І ўсё астатняе, што робіцца ў нашым агенцтве, я не называў бы гэта холдынгам, — заснавана на стварэнні інфармацыі. У аснове ўсіх нашых праектаў — дзве службы: служба інфармацыі і рэдакцыя фотаінфармацыі. Усё астатняе — вытворнае. 20 гадоў таму была створана газета «7 дзён». Востры, «зубасты» штотыднёвік хутка знайшоў сваіх чытачоў. Сёння ён арыентаваны на сям'ю, працуе як асобная рэдакцыя, але ў аснове яго ляжыць інфармацыйная пляцоўка БелТА. Больш як 40 тыс. падпісчыкаў, прычым ведамасная падпіска — каля пяці працэнтаў, а ўсё астатняе — індывідуальныя падпісчыкі. За гэту газету народ галасуе рублём. Для нас гэта дарагога каштуе, і мы стараемся не падмануць іх спадзяванні, быць цікавымі. Часопісы таксама выраслі з таго, што мы валодаем інфармацыяй, банкам звестак фотаздымкаў. У нас ёсць людзі, гатовыя аналізаваць, друкаваць, выдаваць. Дарэчы, у выдавецтве за мінулы год 36 кніг выпусцілі. Сёлета плануем больш. А вось ствараць сваю радыёстанцыю ці тэлеканал... Навошта? Гэта не патрэбна ні краіне, ні нашаму прадпрыемству. У нас сёння дастаткова і fm-станцый, і радыёстанцый, якія працуюць у сярэднім, кароткім дыяпазоне, і арыентаваных на замежжа. Чатыры цэнтральныя тэлеканалы, а колькі яшчэ праграм у рэгіёнах... Аднак сайт, безумоўна, будзе развівацца. І невялікія відэасюжэты не выключаны. Мы працуем таксама над пашырэннем моўных версій нашага сайта (між іншым, англамоўная версія БелТА летась атрымала «Інтэрнэт-прэмію» як найлепшы іншамоўны партал пра Беларусь. — **Аўт.**). Але ведаеце, мне здаецца, сутнасць інтэрнэту не толькі ў сэрвісах, але і ў тым, што мы туды выкладваем. На сайце БелТА размешчана толькі ўласная інфармацыя, падрыхтаваная нашымі журналістамі. І казаць аб тым, што мы будзем канкурыраваць па наведвальнасці з сайтамі, якія выкарыстоўваюць 5 — 10 крыніц, — не даводзіцца. Аднак калі параўнаць такія паказчыкі, як наведвальнасць і цытуемасць, то бачна, што ў многіх наведвальных рэсурсаў цытуемасць невысокая і наадварот.

Да рэкламы тут падыходзяць вельмі і вельмі асцярожна, дазіравана: «У нас сайт — гэта спосаб паведамлення інфармацыі, а не інструмент зарабляць грошы», — тлумачыць прынцыповую пазіцыю гендырэктар БелТА. У планах юбіляраў — пашырацца, пашырацца і яшчэ раз пашырацца: каб спажыўцоў актуальнай і суперааператыўнай інфармацыі станавілася ўсё больш. Пашыраюцца і замежныя сувязі.

— У нас вельмі добрыя кантакты з цэнтральнымі інфармацыйнымі агенцтвамі краін СНД. Супрацоўнічаем з такімі буйнымі агенцтвамі, як Сіньхуа, Prensa Latina, наша інфармацыя ідзе на Рэйтар. На стадыі падпісання цяпер пагадненне з Юнхапньюс — карэйскім агенцтвам. З'яўляюцца даволі шырокія эканамічныя кантакты з Паўднёвай Карэяй, і мы стараемся дапамагаць у атрыманні інфармацыі.

Карэспандэнцкая сетка таксама разрастаецца: апроч традыцыйных для абласных цэнтраў бюро БелТА, створаны пункты ва ўсіх памежных з Беларуссю дзяржавах, акрамя Латвіі. Аднак і гэты прабел кіраўніцтва ў хуткім часе разлічвае запоўніць. Улкары БелТА ёсць у Варшаве, Вільнюсе, Маскве, Кіеве, Кішынёве і нават Нью-Ёрку.

### АДМЫСЛОВАЕ СВЯТА

90-годдзе — асаблівая дата: ёсць нагода для лірычнасці і медытатыўнасці. Таму і святкаванне асаблівае.

— Гэта не будзе святкаваннем у звыклым сэнсе. Да юбілею мы падрыхтавалі фотаальбом. І сёння правядзём яго прэзентацыю ў кінатэатры «Беларусь», — кажа Дзмітрый Жук. — Альбом па сутнасці пра гісторыю Беларусі — 90 гадоў разам з краінай. Гэта погляд сучасніка на сучасніка. Я заўважаў, што людзі, разглядваючы старыя фотаальбомы, вельмі ўважліва ўзіраюцца ў твары, нібы спрабуюць зразумець, чым жылі гэтыя асобы. Мне здаецца, гэты альбом крыху прыадкрые заслону...

***Няхай і надалей БелТА застаецца гэткім першаадкрывальнікам — пралівае святло на вартыя ўвагі падзеі, з'явы, а ў яго аб'ектыве будзе сучаснік — герой нашага часу, — такі, як ёсць. ШЧЫРА ВІНШУЕМ КАЛЕГ З ЮБІЛЕЕМ!***

**Ала МАЧАЛАВА.**

## Даслоўна

### Сёе-тое пра работу расказалі і белтаўцы «старой загартоўкі»

***Вячаслаў ДУТАЎ, аглядальнік газеты «7 дзён»:***

— Калісьці ў пачатку свайго журналісцкага шляху, яшчэ да працы ў БелТА, я дапусціў памылку, прысвоіўшы знатнаму сталявару, дэпутату Вярхоўнага Савета БССР Дзмітрыю Барашкіну, званне Героя Сацыялістычнай Працы. На працу ў газету мяне не прынялі, а са шматтыражкі, у якой працаваў на той момант, давялося звольніцца «па ўласным жаданні» — памылкі ў друку тады многага каштавалі. А пасля, калі я ўжо працаваў у БелТА (з 1965 года), яму гэта званне прысвоілі насамрэч...

Вось якім празорліўцам аказаўся журналіст, уладальнік ордэна Францыска Скарыны, між іншым. З 90 гадоў існавання БелТА Вячаслаў Дутаў працуе тут амаль палову. Яму ёсць з чым параўноўваць журналістыку сённяшнюю:

— Раней да інфармацыі было больш літаратурнага патрабавання. Цяпер больш аператыўнасці, фактуры. Інфармацыйная журналістыка стала больш лабавой, без лішняга апярэння...

***Аліна ШРУБОК, вядучы рэдактар галоўнага выпуску, узнагароджана медалём Францыска Скарыны:***

— Вядучы рэдактар павінен разбірацца літаральна ва ўсім — ад падзей на міжнароднай арэне да таго, колькі трэба нарыхтаваць корму на галаву жывёлы. Рытм нашай работы неверагодны. Нам дыктуюць з месца падзеі, і мы куляй, можна сказаць, выпускаем інфармацыю, вядома ж, праверыўшы папярэдне, каб не было ніякіх ляпаў. Толькі тады можам націскаць кнопку «выпуск». Увогуле не ўяўляю свайго далейшага жыцця без працы ў агенцтве. У нас вельмі дружны, апантаны работай калектыў. І хоць працаваць трэба восем гадзін, у нас людзі, здараецца, у 9 прыходзяць і ў 21 сыходзяць...

# «МЭТА — АДНА: КАБ ЛЮДЗІ БЫЛІ ЗАДАВОЛЕНЫ ЖЫЦЦЁМ»

***Вынікі сельскагаспадарчага года падводзяць не толькі хлебаробы, але і іх гарадскія шэфы. У сёлетнім багатым караваі ёсць вялікая доля і іх працы. Знаёмім з адрасамі эфектыўнай садружнасці.***




**Пра вытворчыя справы адкрытага акцыянернага таварыства «Краснасельскбудматэрыялы» мы расказваем параўнальна часта, апошняя такая публікацыя была змешчана 14 кастрычніка і выклікала станоўчыя водгукі чытачоў.**

**Але гэты калектыў дбае не толькі пра ўласныя паказчыкі і ўласны дабрабыт, яшчэ ён паспяхова шэфствуе над сельскагаспадарчым прадпрыемствам, якое параўнальна нядаўна можна было аднесці да ліку праблемных.**

## Перадавікі вытворчасці дзяржаўнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «ПАДАРОСК»

**ГУРЫН Віктар Анатольевіч — трактарыст-машыніст.**
**ЛЯХ Яўген Аляксандравіч — вадзіцель.**
**АГІЕВЕЦ Аляксандр Міхайлавіч — трактарыст-машыніст.**
**ЛЯХ Уладзімір Восіпавіч — трактарыст-машыніст.**
**АЖАХОЎСКІ Юрый Юр'евіч — трактарыст-машыніст.**
**КРАСОЎСКІ Дзяніс Іванавіч — трактарыст-машыніст.**
**ГРАСЕВІЧ Міхаіл Аркадзьевіч — вадзіцель.**
**ГРАЗДЗЕЙ Валянціна Васільеўна — аператар машыннага даення.**
**ПРАТАСЕВІЧ Анжэла Леанідаўна — аператар машыннага даення.**
**ЦІШКО Алена Уладзіміраўна — аператар машыннага даення.**
**ХІЛЬМАН Яніна Іванаўна — жывёлавод.**
**САЎКО Ядзвіга Іванаўна — жывёлавод.**
**ПАЛУБОК Марыя Іванаўна — жывёлавод.**
**МЫШКЕВІЧ Алена Эдуардаўна — першы намеснік дырэктара.**

### *Учынак, варты Зоі Касмадзям'янскай*

Размову пра справы аграрныя мы вядзём з намеснікам генеральнага дырэктара ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» Мар'янам Вацлававічам Юроўскім у машыне, па дарозе ў падшэфную гаспадарку — ДСУП «Падароск».

Хоць і размешчана гаспадарка ў Ваўкавыскім раёне, але шлях не блізкі — 40 кіламетраў. А калі мець на ўвазе яе працягласць — 30 кіламетраў ад «мяжы да мяжы», то іншым разам, каб трапіць у аддаленую вёску, шэфам даводзіцца «адмахаць» усе сем дзясяткаў.

Так што пагаварыць час у нас быў. Мар'ян Вацлававіч расказвае:

— Дырэктарам там цяпер чалавек надзвычай энергічны, Галіна Іванаўна Філютчык. Да яе вельмі слабенькім саўгасам кіравалі шэсць мужчын, і не справіліся.

Галіна Іванаўна кіруе ўжо сем гадоў, па сваёй добрай волі пераехала ў «глыбінку» са слыннай Гожы, што пад Гроднам. Паверце, гэта быў учынак, варты Зоі Касмадзям'янскай. Сказаць, што было ёй цяжка, гэта азначае, нічога не сказаць. А тут яшчэ тры гады таму да «Падароска» далучылі суседнюю, наогул «ляжачую» гаспадарку. Не дзіва, што працуюць і яна, і яе «правая рука» — першы намеснік дырэктара Алена Эдуардаўна Мышкевіч вельмі многа, не будзе вялікім перабольшаннем сказаць, дзень і ноч. Памочнікаў падабралі такіх жа, як і самі, па-добраму «ўпёртых», ініцыятыўных.

Нам прыемна мець справу з гэтай камандай, працягвае Мар'ян Юроўскі. Яны змаглі падняць абедзве праблемныя гаспадаркі з каленяў, стварыць адзіны працаздольны калектыў, які сёння ўжо нават мае чым пахваліцца.




### *Інвестыцыі ад шэфаў — у будаўніцтва*

Дырэктара на месцы не засталі, ад'ехала на ферму. Многа клопатаў у аграрыяў і сёння. Адна гарачка скончылася — другая пачалася. З журналістамі сустрэлася эканаміст Ірына Францаўна Волава, надзвычай інфармаваны і нераўнадушны чалавек. Загаварылі пра саўгасныя справы, пра шэфскую дапамогу.

— Прадпрыемства «Краснасельскбудматэрыялы» шэфствуе над намі з 2005 года і дапамагае істотна. І не толькі набываць крайне патрэбную нам тэхніку, той жа трактар МТЗ-82 ці кормараздатчык, даільную ўстаноўку фірмы «Дзюваль» ці плугі найноўшай канструкцыі. А таксама гаруча-змазачныя матэрыялы, фосфарныя і азотныя ўгнаенні (і гэта ў той год, калі ў фондах не было ні грама-такі ўгнаенняў для гаспадарак рэспублікі. Шэфы дамаўляліся са сваімі дзелавымі партнёрамі, прасілі іх выпусціць звышпланавыя тоны).

У нас, адзначыла Ірына Волава, выконваецца досыць вялікая праграма будаўніцтва, рэканструкцыі і рамонту, у тым ліку жывёлагадоўчых фермаў, і шэфы аказваюць сапраўды незаменную дапамогу, у тым ліку і сваёй прадукцыяй — будаўнічымі матэрыяламі, шыферам, бетонам.

...Прыемна было пачуць, што інвестыцыі ад шэфаў аграрыі ўкладваюць у такую доўгатэрміновую справу, як будаўніцтва і рэканструкцыя.

Мы ўважліва пагарталі справаздачы за некалькі апошніх гадоў. Зрабілі выпіскі: сродкі і матэрыялы, выдзеленыя прадпрыемствам, пайшлі на будаўніцтва склада мінеральных угнаенняў, выгулаў для жывёлы, рэканструкцыю цялятніка, капітальны рамонт дахаў на трох цялятніках і кароўніку. (Дахі да гэтага стаялі па 40-45 гадоў, і ніхто іх не чапаў. Можна толькі ўявіць, што гэта былі за дахі.)

А яшчэ на рамонт цэнтральнай майстэрні з заменай аконных блокаў, будаўніцтва кутка для жывёлаводаў і лазні для механізатараў і жывёлаводаў... На кожны год запаўняецца досыць вялікая «прасціна».







### *«Каралева палёў» вывела ў лідары*

Распыталі Ірыну Францаўну, якія вынікі ўборачнай кампаніі. Аказалася, сёлета гаспадарка сабрала амаль 12 тысяч тон збожжа. Магчыма, для некага сярэдняя ўраджайнасць 43,7 цэнтнера з гектара невысокая, але для «Падароска» гэта сур'ёзная прыступка на лесвіцы, што адназначна вядзе наверх.

Зямля з яе невысокай бальнасцю за апошнія гады граматнага, клапатлівага гаспадарання набрала ўрадлівасці, і добры ўраджай збожжавых дазволіў разлічыцца з дзяржавай. Дарэчы, атрымалі добры ўраджай рапсу — далі два «планы», а па кукурузе выйшлі на лепшы паказчык у раёне.

Неблагія прывагі жывёлы, растуць надоі, малако ўстойліва рэнтабельнае, яго рэнтабельнасць нават большая, чым у моцных гаспадарак.

У апошнія гады ствараюць салідны запас кармоў: за тры апошнія аб'ёмы нарыхтоўкі сенажу выраслі больш, чым у тры разы. Так і павінна быць у гаспадарцы малочна-мясной накіраванасці.

### *Хто хоча зарабіць — той заробіць*

— Людзі атрымліваюць нядрэнную для вяскоўца, які мае яшчэ што-нішто з уласнага агарода і падворка, зарплату, — працягвае І. Волава. — У жніўні зарплата склала ў сярэднім па гаспадарцы 750 тысяч рублёў. Механізатары зарабілі ў тым жа жніўні па 1 мільёну 300 тысяч, а вадзіцелі больш чым па мільёну. Даяркі — да 800 тысяч рублёў.

А яшчэ ўсе працаўнікі атрымалі бясплатна збожжа ў лік натуральнай аплаты, асобныя механізатары і даяркі — больш за тону. Для вяскоўцаў гэта важна.

Хто хоча зарабіць, а не проста атрымаць, і не лянуецца, той заробіць, лічаць у гаспадарцы.

Пакуль не было дырэктара, эканаміст сказала ў яе адрас добрыя словы: яна і будаўнік, шмат чаго будуе, і пра людзей клапоціцца, і патрабавальная, любіць дысцыпліну.

### *Жанчына, якая замяніла шэсць мужчын*

Так што калі прыехала Галіна Іванаўна, мы ўжо многае ведалі пра «Падароск», яго ўчарашні і сённяшні дзень. Тым не менш дырэктар дадала шмат яркіх фарбаў у карціну вясковага жыцця. Вытворчасць збожжа (без кукурузы) сёлета вырасла ў тры з паловай разы нават у параўнанні з недалёкім 2005 годам. Наогул вытворчасць валавой прадукцыі ідзе з апераджэннем: сёлетняе заданне — 111 працэнтаў, а па выніках 8 месяцаў атрымалі амаль 137. Машынна-трактарны парк папоўніўся новай тэхнікай: трактарам, бензавозам, раскідвальнікам «Гаспадар».

— Цяпер у нас многа новай тэхнікі. Сёлета ніводзін «Дон» не працаваў на палях саўгаса, бо маем пяць камбайнаў «Ліда-1300» і тры «Джон Дзіры», вось яны ў асноўным і ўбіралі. Людзі на іх працуюць нармальныя, хлопцы — малайцы. І трактары ў нас магутныя. Пра МТЗ-1221 я ўжо не кажу, а ёсць дзве наогул супер-машыны: МТЗ-1523 і МТЗ-2522. Найцудоўнейшая айчынная тэхніка.

Безумоўна, трактарам маркі «Джон Дзір» мы таксама вельмі задаволены. Тэхніка выручае нас пры дэфіцыце людзей, які адчуваецца. Ідзе і пераўзбраенне фермаў, укараняюцца новыя тэхналогіі.

### *«Канёк» дырэктара — жыллё*

Каб наталіць кадравы голад, дырэктар з першых дзён сваёй работы ў «Падароску» ўзяла курс на будаўніцтва жылля. За гады яе кіраўніцтва ў саўгасе пабудавана 30 дамоў для рабочых і спецыялістаў. Давайце шчыра скажам, што гэта — многа.

Застаючыся ўдзячнай шэфам і ўласнаму калектыву, які апошнія гады працуе дастаткова зладжана, Галіна Іванаўна ўсё ж больш схільна тлумачыць тое, што гаспадарка адчула «цвёрдую зямлю» пад нагамі, пастаянным клопатам з боку дзяржавы.

Формы гэтага клопату розныя. Тут і субсідыі, і інвестыцыйныя праграмы, і магчымасць набыць тэхніку па лізінгу. Эканаміст дадае ад сябе, што сёлета з дапамогай рэспубліканскага бюджэту была пабудавана сушылка, «якая нас выратавала — ішоў сапраўдны вал збожжа».

— І льготныя крэдыты на будаўніцтва фермаў, — працягвае Галіна Іванаўна. — Дзякуючы гэтаму адну чаргу завяршаем, другую пачынаем.

### *«Мы разам і сёння»*

Размова ідзе «па крузе» і зноў вяртаецца да тэмы шэфства. Галіна Іванаўна не шкадуе добрых слоў для шэфаў.

— Ніколі не забуду іх 600 мільёнаў рублёў, выдзеленых нам у самы першы год іх прыходу. Гэтыя грошы сталі нашым «стартавым капіталам», калі хочаце.

Але адзначыла: за кожную капейку, атрыманую ад акцыянернага таварыства, даводзіцца трымаць перад ім справаздачу.

— Калі падвесці нейкі вынік, то можна сказаць, што ў нас справы сёння ідуць стабільна добра, — дыпламатычна гаворыць Галіна Іванаўна. — Але мы да гэтага ішлі вельмі доўга. Мы ведаем, з чаго вылазілі.

Асабіста ў мяне адна мэта: каб гэтыя людзі былі задаволены жыццём. Каб яны працавалі і зараблялі так многа, колькі ім хочацца.

І дзякуй нашым шэфам, яны ў нялёгкія часы былі побач. Мы разам і сёння.

**НА ЗДЫМКАХ:**

**1. Старажылы вёскі Падароск не ўяўлялі сваю малую радзіму такой, якой яна выглядае сёння.**

**Шырокая вуліца з прыгожымі, утульнымі катэджамі — сведчанне вялікіх перамен у вытворчым і сацыяльным жыцці глыбінкі. А яшчэ — пастаяннай дапамогі дзяржавы і шэфаў.**

**Цялятніца Ядзвіга САЎКО жыве ў адным з такіх новых дамоў і, як бачна на здымках, упрыгожвае свой падворак таксама па-новаму. Зялёны газон перад ганкам аздоблены кветкамі, а таксама малымі дэкаратыўнымі формамі і казачнымі персанажамі.**

**2. Дырэктар дзяржаўнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Падароск» Галіна Іванаўна ФІЛЮТЧЫК.**

**3. Сучасны комплекс для ачысткі і сушкі збожжа — адна з навінак сённяшняга «Падароска».**

**Гэтыя фотаздымкі зроблены яшчэ ў той час, калі на асфальтаваную пляцоўку перад комплексам адзін за другім прыбывалі аўтамабілі з просам. Поўныя прыгаршні ў хлебароба — гэта заўсёды сімвалічна.**

**Якасць ачысткі і сушкі забяспечана высокадакладнай аўтаматыкай і майстэрствам аператара Паўла ЛАНКОЎСКАГА.**

**4. Высокапрадукцыйная тэхніка даверана ў гаспадарцы такім вопытным механізатарам, як Юрый АЖАХОЎСКІ.**

**5. З дапамогай сучасных каналаў сувязі дыспетчар Наталля ЯНКОЎСКАЯ трымае руку на «пульсе» дзелавога жыцця гаспадаркі.**

**А мы падчас паездкі на самы поўдзень Ваўкавыскага раёна пабывалі на новай малочнатаварнай ферме ў вёсцы Канюхі, будаваць якую дапамагалі гарадскія шэфы.**

**На мехдвары пазнаёміліся з механізатарам Дзянісам КРАСОЎСКІМ, якому даручаны магутны энерганасычаны «Джон Дзір», а таксама з загадчыкам майстэрні Сяргеем АРЛОВЫМ і практыкантам з Пружанскага агратэхкаледжа Вадзімам УРБАНАМ.**

**6. Сядзібна-паркавы ансамбль у Падароску, гаспадарамі якога ў розныя часы былі каралева Рэчы Паспалітай Бона, а затым памешчыкі Бохмісы — пастаўшчыкі казачнай прыгажосці ружаў і апетытных сыроў да царскага двара, чакае інвестара, які даў бы другое жыццё і моцнаму яшчэ панскаму дому, і старажытнаму парку на беразе рукатворнага возера з вялікай чарадой лебедзяў у камышах.**

**Дарэчы, у парку шмат рэдкіх парод дрэваў і кветак, знаўцы нават называлі нам нейкую нерэальную лічбу: 140 відаў.**

**А мясцовыя гаспадыні менавіта тут бяруць зямлю для сваіх ружоўнікаў.**

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Віктар ПАЗНЯКОЎ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 500029322






Вадзім АНДРЭЙЧЫК:

# «Я САМ САБЕ ГАТУЮ ЕЖУ»

## 28-гадовы гродзенец — чэмпіён свету па бодыбілдынгу



На чэмпіянаце свету па класічным бодыбілдынгу, які праходзіў у Калінінградзе, узялі ўдзел больш за 100 спартсменаў з 27 краін. Таму ўдвая прыемна, што наш Вадзім Андрэйчык прывёз з прэстыжнага турніру залаты медаль. Тым больш, што Беларусь упершыню была сярод удзельнікаў.

Класічны бодыбілдынг сярод мужчын быў афіцыйна прызнаны спартыўнай дысцыплінай Выканаўчым Саветам Міжнароднай федэрацыі бодыбілдынгу і фітнэсу ў Шанхаі (Кітай) 27 лістапада 2005 года. Гэты від спорту заклікамістэ вярнуць бодыбілдынгу яго першапачатковае аблічча. Не гіпертрафаваныя анаболікамі мышцы, а атлетычны, эстэтычна прывабны целасклад — тое, што ў свой час называлася «культурызмам».

— Шчыра кажучы, у прафесійны бодыбілдынг я прыйшоў зусім нядаўна — сёлета, — расказвае Вадзім. — Дагэтуль жа як і ўсе хлопцы хадзіў у трэнажорную залу, так званую «качалку», глядзеў за сабою, правільна харчаваўся. Першым турнірам для мяне стаў Кубак Гродзенскай вобласці, на якім заняў другое месца. Далей быў чэмпіянат краіны — зноў другое месца. Некалькі месяцаў таму на Адкрытым кубку Магілёўскай вобласці стаў абсалютным чэмпіёнам і атрымаў запрашэнне на чэмпіянат свету ў Калінінград.

***— Кажуць, у Калінінград вы ездзілі за свае грошы...***

— Не, гэта няпраўда. У мяне была дамоўленасць з федэрацыяй, што фінансаванне будзе за іх кошт, яшчэ да таго, як я даў згоду на ўдзел у чэмпіянаце свету. Таму плёткі на гэту тэму не маюць падставы. Федэрацыя плаціла за авіябілеты на самалёт Гродна — Калінінград, а ўжо там сустракалі арганізатары.

Усё, што абяцалі ў федэрацыі, яны выканалі.

***— Падрыхтоўка да турніру ўключала ў сябе правільнае харчаванне — што гэта для вас?***

— Тут трэба таксама расказаць і пра рэжым. Безумоўна, першым чынам — гэта здаровае харчаванне. Алкаголю па мінімуму, цыгарэт таксама. Я ж як любы малады хлопец магу і піва выпіць, люблю на начную дыскатэку схадзіць. Зрэдку дазваляю сабе цыгарэту выкурыць... Дык вось з усім гэтым давялося «завязаць». 4-5 разоў на тыдзень хаджу на сур'ёзныя трэніроўкі працягам па 1,5-2 гадзіны, таму грошай на прадукты харчавання шкадаваць не трэба. Гэтаксама, як не шкадаваў я іх на спецыялізаваныя харчы — сываратачныя пратэіны, розныя амінакіслоты. Трэба есці паболей мяса, яек, натуральнай ежы, і менавіта варанай.

***— І што, самі ўсё гатуеце?***

— Так. Ніхто лепей за сябе самога і для сябе не прыгатуе. Палову майго рацыёну ўвесь апошні год складала звыклая ежа, другую палову — вышэй пералічаная спецыялізаваная. Безумоўна, яна каштуе грошай. Аднак у нашым спорце без гэтага немагчыма дасягнуць высокіх вынікаў. Пратэін, напрыклад, гэта расшчэплены бялок. А бялок неабходны арганізму ў якасці будаўнічага матэрыялу. І патрэбны ён для таго, каб арганізм эфектыўна засвойваў ежу для будавання мышачнай клеткі. Калі мы з'ядзім кавалак мяса, гэта ж не азначае, што назаўтра на целе вырасце такі ж. Можна разлічваць, мабыць, на адзін працэнт, і то толькі пасля трэніроўкі.

***— Ажаніцца не збіраецеся? У народзе пагаворваюць, што ваш від спорту не самы небяспечны для мужчыны?***

— Разумею, пра што вы ведзяце гаворку. Мабыць, тыя людзі, якія кажуць, што наша харчаванне ўплывае на мужчынскую моц, не поўнасцю валодаюць інфармацыяй. У той час, калі ў нашай краіне толькі нараджаўся бодыбілдынг, людзі для больш хуткага набору масы ўжывалі танныя сродкі тыпу метану. Такія «харчы» былі першымі з даступных у нас. Галоўнае, што не было дастатковай колькасці інфармацыі, якая б даводзіла да чалавека нормы ўжывання гэтай фармакалогіі. Таму многія маладыя хлопцы перабольшвалі з гэтым. Як кажуць, утапіцца можна і ў лыжцы з вадою. Менавіта няправільнае ўжыванне і прыводзіла да незваротных перамен у арганізме.

***— Чым захапіў бодыбілдынг канкрэтна вас?***

— Я пачынаў больш за 10 гадоў таму. Вучыўся тады ў хіміка-тэхналагічным тэхнікуме курсе на другім. Займаўся кунг-фу, якое давала неабходную баявую падрыхтоўку. А вось фізічнай не хапала. І вось за апошнія дзесяць гадоў я напрацоўваў неабходны вопыт шляхам спробаў і памылак. Дапамагалі трэнеры — я ж адразу ў некалькіх клубах трэніраваўся. Дзякуючы ўсяму гэтаму і магу сказаць, што сёння маю гарманічнае цела.

***— Падчас выступлення спартсмен на сцэне заўсёды ўсміхаецца. Не цяжка?***

— (*Смяецца.*) Лічу, з залы добра бачна. Вядома, цяжка. Гэта ж не проста ўсмешка, а максімальная напруга ўсяго цела. Трэба пазіраваць, выдатна паказваць свае лепшыя якасці і да таго ж усміхацца. Заўсёды ўсміхацца!

***— І што ж вы яе — усмешку — перад люстэркам трэніруеце?***

— Н-е-е-е. Трэніруем у асноўным сваё выступленне, каб правільна паказаць усе позы. Максімальна прыгожа вывесці ўсе мышцы для гледача. Банальна пазіраваць не азначае поспех. Некаторыя спартсмены маюць добрае цела, аднак дрэнна падрыхтуюць праграму і з-за гэтага саступаюць. А трэба ж, каб добра разглядзелі суддзі. Павярнуцца да аднаго суддзі, да другога, трэцяга... Канцэнтрацыя неверагодная, што само па сабе — нялёгкая праца.

***— Псіхолагі сцвярджаюць, што ўсмешка мае шмат агульнага з аскалам жывёл, якія такім чынам палохаюць сваіх ворагаў...***

— Чаму ўвогуле патрэбна ўсмешка? Згадзіцеся, знаходзячыся на сцэне любы чалавек павінен усміхацца — ці то мадэль, спявак або спартсмен... У нас выступленне працягваецца адну хвіліну. І дзеля таго, каб яно не глядзелася агрэсіўна, на твары пажаданая ўсмешка. Гэта як прывітанне пры наведванні нейкага грамадства. Ну і проста прыгожа, лепей, чым надзімаць шчокі ці бровы «домікам» рабіць.

***— Чым па жыцці займаецеся?***

— Цяпер я беспрацоўны, дакладней, знаходжуся ў пошуках лепшай працы. Люблю сустрэцца з сябрамі, завітаць у бар, партыю ў більярд згуляць. Апошнім часам святкавалі маю перамогу — са сваякамі, сябрамі, калегамі па трэнажорнай зале...

***— Мабыць, з гэтай нагоды і працу пакінулі — каб больш часу святкаваць заставалася?***

— Не, з гэтым ніяк не звязана. Усяму свой час, і меру ў гэтай справе я ведаю. Я ж падчас вучобы трымаў дыплом па спецыяльнасці «электратэхніка» ў Гродзенскім хіміка-тэхналагічным тэхнікуме. Да апошняга часу працаваў аўтаслесарам, аднак тое, што меў, не прыносіла жаданага фінансавага выніку.

***— У сталіцу з гэтай нагоды не плануеце перабрацца?***

— Пакуль што нават думак такіх не было. Я Гродна люблю. Тут я нарадзіўся і мне падабаецца назіраць, як мой родны горад прыгажэе, з'яўляюцца новыя дамы, перабудоўваюцца сеткі дарог. Што важна, наш горад чысты. Мінск, бясспрэчна, таксама прыгожы і чысты — сталіца ёсць сталіца. А вось Калінінград, дзе праходзіў чэмпіянат свету, даволі брудны. Дамы і вуліцы ў іх неяк негарманічна аб'яднаны — ні для людзей, ні для машын. Мясцовыя жыхары, дарэчы, самі гэта прызнаюць.

***— Апошнім часам ходзяць чуткі, што ў вашым любімым горадзе Каложскую царкву рэстаўраваць будуць...***

— Такія чуткі ходзяць кожны год, а працы пакуль не відаць. У нас у Гродне пра гэта ніхто размовы не вядзе, у мясцовых газетах таксама нічога не пішуць. Зіма — гэта ж не час для будоўлі на такім аб'екце. Мабыць, вясною што-небудзь адбудзецца?

**Юрась ШАЎЦОЎ.**

# ЯК ГАРТАВАЎСЯ «ЧАЛАВЕК З ЖАЛЕЗА»

**Кінапаказ**

**У Мінску адбыўся паказ фільма польскага рэжысёра Анджэя Вайды «Катынь». Гэтую стужку маглі пабачыць у Беларусі яшчэ ў першай палове года — сёлета фільм быў намінаваны на «Оскара» сярод замежных фільмаў, пра яго шмат пісалі і гаварылі ў свеце, пры гэтым самай галоўнай інтрыгай тады была гэтая: а ці пакажуць яго ў Расіі? Аднак і там яго маглі пабачыць, а публіка, якая сабралася на прагляд у Маскве, прыняла стужку як грамадзянскі ўчынак аўтара. І зразумела — чаму.**

Я ведала, пра што фільм. Гісторыя катыньскай трагедыі праходзіла неяк міццю ў «Гістарычных хроніках» Мікалая Сванідзэ, праўда, злавіла я яе ў цыкле дакументальных фільмаў выпадкова, амаль ноччу... Зацікавілася таму, што ведала: гэта датычылася ў тым ліку і нашай краіны — шмат беларусаў былі прызваныя ў польскае войска, калі Чырвоная Армія ўвайшла ў Заходнюю Беларусь. У польскае войска праводзіла свайго мужа мая бабуля, і болей яго ўжо ніколі не бачыла. Ён быў салдатам, і яму «пашчасціла» — патрапіў у лагер, адтуль у армію Андэрса, як і адзін з герояў фільма Вайды. Але афіцэры польскай арміі былі расстраляныя НКУС у 1940-м годзе ў расійскай Катыні...

Я ведала, чаго чакаць ад фільма — звароту да тых падзей. Ведала, што для аўтара гэта балючая тэма: сярод расстраляных у Катыні быў яго бацька. І ўсё-такі не чакала, што ён ускалыхне ў ва мне столькі эмоцый і думак пра каштоўнасць чалавечага жыцця ў розныя часы. Пра злачынствы сталінскага рэжыму ў Расіі зняты не адзін фільм, дзе ёсць крывавыя сцэны. Аднак мяне папярэджвалі, што фінал «Катыні» — не для слабанервовых. І сапраўды, перад вачыма ўсё яшчэ стаяць кадры, як бульдозер засыпае зямлёй цела чалавека, які ў руках сціскае нацельны крыжык...

Але найбольш кранула ў карціне не гэта. Не дакументальная аснова, і не спроба паказаць, як усё было. Не палітычныя варункі, у якія трапляюць людзі, якія апынуліся паміж двух агнёў: фашысцкай Германіяй і сталінскім Саюзам і не ведаюць, куды бегчы, каб уратавацца. Гэтых людзей проста вырашылі растаптаць, а іх краіну дзялілі паміж сабой два дыктатары, якія пра ўсё дамовіліся. А каб краіна не здолела аднавіцца і адстаяць сябе — з яе войскам проста распраўіліся. Ліквідаваў кіраўніцтва арміі — лічы, яе няма. І адным выгадна, і другім...

Кранула менавіта тое, што фільм аўтар здымаў пра людзей, а гістарычныя факты былі фонам, на якім паказаны лёсы. Гэта гісторыя сем'яў, якія чакалі і верылі ў лепшае, якія былі падманутыя і пазбаўленыя надзеі. Фільм пра тых, хто перажыў сваё гора ціха, і пра тых, хто імкнуўся крычаць пра яго, каб пазбавіцца ўласнага болю. А гэта б'е значна мацней за самыя цяжкія сцэны.

Пачынаецца ўсё з падзей у Беларусі. І гэта не выпадкова. Анджэй Вайда прызнаваўся, што з дзяцінства памятае Гродна: яго тата служыў у Сувалках афіцэрам 41-га палка пяхоты. Менавіта трагедыю гэтага палка і гісторыю сваёй маці ён адлюстраваў у фільме. Але карыстаўся рэжысёр знойдзенымі ў катынскім лесе дзённікамі аднаго з польскіх афіцэраў, які апісаў апошнія гадзіны перад расстрэлам. Вайда ў лісце да беларускіх гледачоў вызначыў: «Гэты фільм не сее нянавісці і не заклікае да помсты, аднак абвінавачвае сталінскі рэжым, які быў не менш бесчалавечным як да ўласнага народа, так і для беларусаў, і для нас, палякаў. Гэта праўда павінна быць агучаная, калі мы прагнем сапраўднага яднання паміж народамі».

Калі славуты польскі рэжысёр атрымаў «Оскара» за заслугі ў кінематографе, то рэкамендуючы яго Сцівен Спілберг пісаў: «Прыклад Анджэя Вайды нагадвае нам, стваральнікам кіно, пра тое, што часам гісторыя ставіць нас перад выпрабаваннямі, патрабуючы ад імя гледачоў падтрымкі іх духу, паказваючы, што мы можам апынуцца перад неабходнасцю рызыкаваць кар'ерай, абараняючы свой гонар і гонар нашых народаў». Сапраўды, Вайда заўсёды лічыўся рэжысёрам, само мастацтва якога было ўчынкам. Яго творчыя ўчынкі былі адзначаныя галоўнымі прызамі на кінафестывалях у Канах і Венецыі. Стужкамі «Чалавек з мармуру» (1977 г.) і «Чалавек з жалеза» (1981 г.) ён сцвярджаў, што творчасць нельга аддзяляць ад чалавечай і грамадзянскай пазіцыі. Яго грамадзянская пазіцыя заключалася ў тым, што ён хацеў бачыць свабоднай краіну, якая ў XIX стагоддзі не прысутнічала на карце Еўропы. Прыклад палякаў даказаў, што можна страціць краіну на нейкі час, але нельга яе страціць назаўсёды, калі яна ёсць у думках людзей. Як усё зразумела: Беларусь прайшла свой шлях у гэтым накірунку.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# Харошы выгляд

**Выстава**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Артысты ансамбля «Харошкі» — прыклад таго, як маглі выглядаць жыхары Беларусі розных саслоўяў у розныя часы. Касцюмы іх ствараліся і распрацоўваліся адмыслова для праграмаў, якія адлюстроўвалі ў музыцы і танцы пласты беларускай культуры. Таму выстава касцюмаў ансамбля «Харошкі», якая адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі, паказвае па сутнасці асаблівасці вопраткі беларусаў.

У экспазіцыі каля 30 касцюмаў аўтарскай работы. Каб іх стварыць, мастакі па касцюмах Юрый Піскун і Юрый Гаявы вывучалі нацыянальныя традыцыі беларусаў, звычаі і касцюмы — не толькі традыцыйны вясковы, але вопратку гараджан і знатных асобаў. На аснове старажытных беларускіх абрадаў, напрыклад, будавалася праграма «Тураўская легенда», «Полацкі сшытак» — гэта вобраз беларускага Сярэднявечча, «Добры вечар, госці!» знаёміла з гарадскім фальклорам, але ж былі яшчэ «Жаніцьба Цярэшкі», «Беларусы», якія адлюстроўвалі традыцыйныя і святочныя абрады... Нядзіўна, што за 35 гадоў існавання харэаграфічнага ансамбля ў яго касцюмерных захоўваецца пяць з паловай тысяч сцэнічных касцюмаў. Іх можна лічыць асобнымі творамі мастацтва, кожны строй вылучаецца аздобай, цікавымі канструктыўнымі знаходкамі. Каб уявіць сабе ўсё гэтае багацце, мала адной выставы. Зрэшты, можна сачыць за канцэртамі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 32 (600)

аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты:
р/р 3012210270016
у ААТ "Белінвестбанк"
г.Мінска, код 739
УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

***ПРАДАЕЦЦА***

❒ Дом памерам 11х7 м, можна на знос, у в. Галынь Навагрудскага раёна.
Тэл. 8 029 253 35 69.

❒ Кватэра 2-пакаёвая ў в. Астравянец Ушацкага раёна.
Тэл. 8 029 599 51 62.

❒ Кватэра 3-пакаёвая, кааператыўная, маецца тэлефон, гараж, у райцэнтры Гарадок.
Тэл. 8 0212 48 08 09, 8 029 216 17 09.

❒ МТЗ-80Л прычэп, акучнік, культыватар, бульбазбівалка, шыпы да МТЗ, паліўная помпа і інш з/ч да МТЗ.
Тэл. 754 52 55.

❒ Прычэп трактарны 2-восны — 550 у.а., плуг 2-корпусны без рамы — 100 у.а.
Тэл. 8 01632 47 319.

❒ «Аўдзі-80», 1981 г.в., выдатны стан — 1 тыс. у.а.; «Форд-фіеста», 1997 г.в., 1,3б.
Тэл. 8 029 767 46 51.

❒ «Джэта-1», 1981 г.в., 1,3б., нядорага; цыркулярка да трактара з наборам пілаў.
Тэл. 8 029 723 06 67.

❒ Племянны казёл зааненскай пароды.
Тэл. 8 02137 39 154.

❒ Біблія ў выдатным стане, 3 тыс. рублёў
Тэл. 80212258079.

❒ Электрапліта «Гефест» (Брэст), шклокераміка 50х60.
Тэл. 8 017 295 96 84, 8 029 115 56 99.

❒ «Вольва-460», салон — велюр, цана па дамоўленасці.
Тэл. 8 01793 32 376, 26 90 111.

❒ Матацыкл мінскі, прабег 180 км, легкавы прычэп МАЗ 381144, ружжо двухствольнае ТОЗ 16 калібру, кацёл ацяпляльны чыгунны.
Тэл. 8 029 291 48 49.

❒ «VW-гольф», 1987 г.в., у выдатным стане.
Тэл. маб. 902 82 69.

❒ Кацёл для лазні на цвёрдым паліве.
Тэл. 8 029 876 93 46, 8 017 242 72 42.

❒ Гармонік «Беларусь», цана па дамоўленасці.
Тэл. 8 01719 478 22.

❒ Трактар МТЗ ці Т-40.
Тэл. 8 029 619 66 59.

❒ Козлік 10-месячны добрай пароды.
Тэл. 8 01776 600 23.

❒ Культыватар КП-4 да МТЗ, плуг да Т-25.
Тэл. 8 029 291 48 49.

❒ Скутар «Мустанг» 49,5 куб. см, 1250 у.а.
Тэл. 396 20 66.

❒ Швейная машына «Зінгер», нажная.
Тэл. 8 029 533 53 48.

❒ «Аўдзі А6», 1996 г.в., 2,5 ТД, універсал, ц/з, сігналізацыя, клімат, 8750 у.а. Тэл. 8 029 11 50 29.

❒ «VW-пасат», 1999 г.в., седан.
Тэл. 8 029 507 88 19.

***КУПЛЮ***

❒ Гуму да МТЗ-82 пярэднюю, аснастку да франтальнага пагрузчыка з каўшом.
Тэл. 8 02133 34 229, 8 029 598 22 64.

❒ Магазін, офіс, склад.
Тэл. 8 029 798 14 42.

❒ Арачнік, ангар.
Тэл. 8 029 337 33 38.

❒ «Каран» за сімвалічную плату.
Тэл. 8 01792 59 497.

❒ Дрэваапрацоўчы станок да МТЗ-05 ці да 220 В.
Тэл. 8 01793 32 376, 26 90 111.

❒ Дом, дачу, пакой да 60 км ад Мінска.
Тэл. 8 044 724 55 90.

❒ Гуму да трактара Т-40.
Тэл. 8 029 610 31 21.

❒ Мотаблок ці трактар, пажадана Т-25, у любым стане.
Тэл. 8 033 665 87 69.

***РОЗНАЕ***

❒ Мяняю кватэру 3-пакаёвую прыватызаваную ў Оршы на кватэру ў Мінску ці раёне.
Тэл. 8 02161 23 25 92.

❒ Мяняю 2-пакаёвую прыватызаваную кватэру ў Віцебску і 3-пакаёвую ў г. Гарадок на кватэру ў Мінску ці Санкт-Пецярбургу.
Тэл. 8 029 216 17 09.

❒ Мяняю «Масквіч-412», прабег 16 тыс. км, на любы калёсны трактар.
Тэл. 8 029 291 48 49.

❒ Здыму памяшканне для ўтрымання жывёлы ад 70 кв. м не далей за 50 км ад Мінска.
Тэл. 8 029 357 64 51.

**Утерянные квитанции** о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) форма 1-СУ серия КВ № 4095409, 4095411 СООО «Белкоопстрах» в г. Гомеле **считать недействительными**.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.**

Пашпарт серыя____________ № ____________ Выданы____________

Подпіс____________ Дата____________

# ЁСЦЬ ТОЛЬКІ МІГ...

**Простая мова**

**Старонкі з дзённіка, якога не было, няма і, відаць, не будзе...**

**Зазімак. Снег — першы, можна сказаць, але ж спорны: упрыгожыў, бялюткай тоўстай коўдрай накрыў усё... У тым ліку — двор ля маленькай крамкі: раніцай па замеценых ім прыступках (дрэнна быць першай) ледзьве ўзнялася...**

**Купіла што-кольвечы, разлічылася. Касірка, выдаўшы рэшту, яшчэ міла ўсміхнулася, дзяжурна пралапатала:**

**— Спасибо! Приходите к нам еще!..**

**Ці трэба казаць, што ўсміхацца і дзякаваць, зразумела ж, лягчэй... І для многіх — куды прыемней, чым махаць рыдлёўкай, расчышчаючы снег.**

**Але ж пры гэтым (не трэба казаць?) і цэняцца яны па-рознаму — тая дзяжурная ўсмешка і чыстыя прыступкі.**

### Што ні край — то звычай

Прыкмета часу — дзеці змыслыя: Янка, прынамсі, доўгі верш пра «Муху-цакатуху» ліха, па памяці, чытала ў тры. Цяпер ёй пяць — вывучае літары. Можна сказаць, нават ведае ўжо, бо агучвае ўсё, што трапіць на вочы — шыльды, рэкламу, назвы вуліц і крам...

У выхадны яе на прагулку вывелі. Двор — прычым, увесь — машынамі быў застаўлены і на адной, апроч нумара, слова — ад рукі, з трох літар:

— Х-ха! — як старую знаёміцу павітала малая, — у-у...

Слова злажылася, але ж незнаёмае. І мама маўчыць...

Добра, што бабуля побач:

— Гэта, — кажа, — Янaчка, па-англійску напісана. Там, у Амерыцы, у Англіі, у Канадзе, людзі вітаюцца так, гавораць адзін аднаму: «Хау а ю?!». Як справы, маўляў?..

Выкруцілася, карацей, падманула ўнучку, пераключыла ўвагу на іншае штосьць. І рада была — два дні. На трэці — пашкадавала, падумала, што памяць у малой — яшчэ тая. І добра, калі ўспомніць яна (паўторыць) пачутае — ангійскае «Хау а ю?» — а калі і напісанае? Ды намалюе яго — у садку ці на шыбцы ў аўтобусе? Калі возьмецца тлумачыць, дзе вось гэтак вітаюцца?

...У нас, мяркуючы па платах ды фасадах, ці не паўсюль.

### На сябе...

Правіла — «Не марнуй свае нервы і час, калі можаш патраціць грошы» — што казаць, слушнае... Шкада, карыстацца ім можна зрэдку — у выключных выпадках.

Спяшаюся вось — выходжу з дому, бягу на прыпынак. Там тралейбус якраз, але ж сёння ехаць далёка і з перасадкамі, часу ў абрэз, таму — стаю, чакаю маршрутку, чакаю пяць хвілін, дзесяць, пятнаццаць...

Галоўнае — спыняюцца яны, людзей падбіраюць, але ж вязуць не туды: па іншых маршрутах.

— Чаму на гэтым нікога? — трацячы цярпенне, пытаю ў аднаго з вадзіцеляў.

— Не знаю... Просто не вышли и всё.

...Прыватнікі, гаспадары (свайму часу ды і транспарту) на сябе працуюць: хочуць — выходзяць, не хочуць — не. З іх не спагоніш.

Хоць і хацелася б!

### Розныя? Родныя!

Раніца, тралейбус — зайшла, а зразумець не магу — штосьць не тое ў ім ці не так: паўсалона дзяцей (гадоў 5 — 10) і... цішыня, мёртвая, можна сказаць. Толькі рухі, толькі твары і тварыкі, толькі ўсмешкі...

Дайшло (хаця і не адразу): дзеці не зусім звычайныя — глуханямыя.

Але ж пры гэтым — прыгожыя, вясёлыя, цёпленька, з густам апранутыя — круцяцца на сваіх сядзеннях, штурхаюцца, смяюцца, нешта адно аднаму паказваюць і (з дапамогай жэстаў) расказваюць...

Што, магчыма, цікава — большасць (і сярод іх!) гарэзы, балбатуны. Маўчуноў — меншасць.

Што, магчыма, яшчэ цікавей — за-мі-ла-ва-нне, з якім глядзелі на іх пасажыры. У тым ліку — і зусім маладыя. «Не бяды, маўляў (чыталася ў іх на тварах), што малое не такое, як іншыя, што глуханямое... Але ж яно — ДЗІЦЯ!»

...Яны, такія, павінны быць разам з усімі, жыць сярод людзей!

Яшчэ і для гэтага.

### «...Так яна і паплыве»

Барысаўна — баба з гонарам. І цяпер... А ўжо, мусіць, была...

Факт, што з абы кім, з некаханым жыццё сваё не звязала, а годны-каханы ды ёй несустрэты, мусіць, і зараз недзе жыве — з кімсьці альбо адзін. І яна — адна. Ці — так будзе дакладней! — з людзьмі, для людзей...

Вось і яны да яе па-людску — з днём народзінаў праз раёнку рашылі вітаць! Напісалі, каго, напісалі, з чым, прыгожанькі вершык дадалі і подпіс — суседкі.

У газеце ж выйшла (хоць мо і грэх пра калег?)...

Не, прозвішча тое... Верш — ужо не. А подпіс і наогул: «Муж, дзеці, унукі».

«Цікава, і дзе ж мне столькі радні набралі?», — дзівілася потым жанчына, але высвятляць не пайшла. Нават не пакрыўдзілася. Як быццам.

Чаму? Ды не першы год на свеце жыве: памятае, як з той жа газеты ў іх вёску чалавек прыязджаў, як пагутарыў са старшынёй і выдаў артыкул — хвалебны, узнёслы. Апошні абзац найболей уражваў: вучыцеся, маўляў, раўняйцеся на жывёлаводаў калгаса...

А ў памянёным калгасе тады ж з галадухі пухлі каровы (статак скараціўся на 200 галоў) — кармоў не хапіла...

Раёнку пасля гэтага людзі ў ваколіцах сталі называць па-рознаму: адны — проста: «Манюка», другія — больш-менш ласкава: «Наш брахунок».

А яно ж вядома — як назавяце вы лодку, так яна і паплыве.

Пакуль не спыняць. Ці не зменіць імя.

### Да здзяйснення?

...Прастудзілася (ці, мо вірус які падчапіла?): каторую ноч амаль не сплю — кашаль, тэмпература... На добры толк — трэба б выклікаць доктара, адляжацца, узяць бальнічны. Але ж потым, перш чым закрыць яго, «пашлюць» на флюараграфію, па іншых кабінетах...

Ад адной толькі думкі, куды, — мароз па спіне. І паўжарт: мара ўсіх афіцыянтак — каб кліенты снедалі, палуднавалі і вячэралі дома, а чаявыя прысылалі ім па пошце. Мара ўсіх урадаў — каб насельніцтва бараніла, вучыла і лячыла сябе само. І пры гэтым — спраўна плаціла падаткі.

Што-кольвечы з гэтага, здаецца, збываецца?

### Ёсць толькі міг...

Паліто было дарагое і амаль няношанае — другі сезон усяго. Таму з нечаканай дзіркай (на спіне, каля каўняра) Люся пайшла ў адну майстэрню, потым — у другую, у трэцюю... У кожнай яе адзежыну доўга разглядалі, круцілі ў руках, пыталіся, як можна было парваць (ды ў гэткім месцы?!) і, пачуўшы адказ, жахаліся...

Што датычыць рамонту, браліся яго зрабіць, прычым — усюды, але ж распавёўшы пра ўсе аперацыі (пачынаючы з адпорвання падкладкі), грошай прасілі столькі...

Паліто было дарагое і амаль няношанае — на дачу «спісваць» шкада, але ж і аддаць ледзь не траціну сваёй зарплаты Люся не магла таксама.

Таму, вярнуўшыся дамоў з чарговай майстэрні, яна... акуратненька адпарола, так званую «лейбу» (вышытую пад вешалкай назву фірмы), гэтак жа акуратненька, уручную «перанесла» яе на дзірку, папрасавала. Потым апранулася, зверху накруціла шалік, паглядзела ў люстэрка. Што ўбачыла? Функцыянальна паліто не пацярпела, дзіркі амаль не відно, так што можна насіць і насіць. А што латка на ім, дык гэта, як кажуць, «дурань не заўважа, разумны не скажа» — нядрэнна ж атрымалася. І танна.

Да таго ж — красамоўна. Калі ведаць «гісторыю дзіркі»...

Бо ўтварылася яна ў прыгожы святочны дзень, калі Люся, праходзячы пад вокнамі суседняга шматпавярховіка, спінай (!) «злавіла»... вострае горла разбітай папалам бутэлькі ад шампанскага. Нейкае боўдзіла скінула. З нейкага акна ці балкона.

### Так атрымалася

Прозвішча ў сям'і славянскае... Хутчэй за ўсё — недзе тут, у СССР, яны (жонка Алена, муж Рыгор і іх дачка) нарадзіліся. Але, відаць, не жывуць, бо (як расказвалі расійскім калегам) прыляцелі з Ізраіля, у Дамадзедаве зайшлі ў вагон аэраэкспрэса. Цягнік крануцца не паспеў, калі аднаму з пасажыраў, мякка кажучы, стала нядобра — без прыкмет жыцця ён паваліўся на падлогу. Муж Алены стаў рабіць яму штучнае дыханне, адна з пасажырак — масаж сэрца. «Доктара ў пяты вагон! Чалавеку дрэнна!», — перадалі машыністу. Замест адказу праз паўзу прагучала: «Дзверы зачыняюцца. Цягнік ідзе без прыпынкаў да Павялецкага вакзала». «Як? — зашумелі пасажыры і сталі сварыцца з машыністам (сарваць стоп-кран ніхто не здагадаўся). Ён жа — вёў свой цягнік. Адно толькі па гучнай сувязі папрасіў доктара (калі той ёсць сярод пасажыраў) у пяты вагон.

Доктара не было. «Хуткай» таксама. Прычым ні на адной станцыі, праз якія нёсся цягнік. Чалавека, як маглі, ратавалі пасажыры. І ён быў нават ажыў — пачаў самастойна дыхаць! Але... Ужо на пад'ездзе да таго Павялецкага вакзала зноў перастаў: «Хуткай» не было... І там!.. Доктар з медпункта сказаў, што ўсё дарэмна — яго вылікалі «на труп» ...

Пасажыры былі ў шоку — усе. Ці не найбольш — сям'я з Ізраіля: Алена ў прыватнасці ніяк зразумець не магла: як так — 45 хвілін (хай у цягніку), але ж у сталіцы паміраў чалавек, і ніхто з прафесіяналаў яму не памог!..

Прозвішча ў сям'і славянскае. Хутчэй за ўсё недзе тут, у СССР, яны нарадзіліся, але цяпер — не жывуць, пераехалі.

Цалкам магчыма — сумавалі. Цалкам магчыма — перажывалі. Цалкам магчыма — не раз шкадавалі...

Болей не будуць?

### ...Што таксама сродак!

Галава бабулю турбавала зранку, але не дужа — можна было цярпець. Таму яна спакойна паснедала, прыбрала ў кватэры, паехала на рынак.

Рабіць гэта, ды з хворай галавой, мусіць, не варта было, бо расхвалявалася, убачыўшы новыя цэны, разнервавалася: ледзь да прыпынку потым дакляпала. Добра, што лаўка там ёсць — пасядзела крыху, супакоілася, дух перавяла. А заадно — пaглядзела на людзей, на тавары ў шапіку: «Сродак ад галаўнога болю» вочы там самі знайшлі. Падумала яшчэ, што кошт прымальны (а ў параўнанні з рынкам — і зусім задарма!), што чаргі ніякай.

Факт, што пакінула на лаўцы вандзэлкі — якогась дзядка папрасіла, каб прыгледзеў крыху... Ну, пакуль яна той «сродак...» купіць. У аптэку ж, маўляў, не набегацца...

Дзед яшчэ паглядзеў на яе...

Але думаць аб тым, **як** ён паглядзеў і чаму, у бабулі часу не было — купіла, што наважылася, дома рашыла прыняць. Дастала з сумачкі, разгарнула і... села. Прычым там, дзе стаяла! Твар заліўся чырванню — у памяці тут жа ўзніклі вочы дзядка, яе ж уласныя словы, пра аптэку, заклапочаны твар кіяскёркі... У абгортцы быў... прэзерватыў. Што таксама ж сродак! І ад яго ж, ад лішняга галаўнога болю!

Ад смеху, думала, зойдзецца — сама, адна, потым суседку паклікала.

Пры ёй жа, на здзіў заўважыла, што галава ў яе не баліць — як рукою зняло. Дапамог, значыць, сродак!..

Праз тыдзень, у пятніцу яна зноў паехала на рынак. Думала па дарозе падыйсці да таго кіёска, расказаць прадавачцы, якая ў яе прыгода была, яшчэ раз, разам з ёй пасмяяцца і падзякаваць.

Але на звыклым месцы шапіка таго не было — знеслі.

### «...Каб не зніклі і гэтыя»

Гэты невялічкі, складзены ўдвая лісток, я з камандзіроўкі прывезла. Тэкст на ім: «...Слухай, браце, а што ты робіш з газетай, калі прачытаеш? Ну, можа, у макулатуру што занясеш ці кавалачак сала загорнеш. Узімку можна вокны паклеіць, увесну — караблік малому зрабіць, а летам — капялюшык, каб на лецішчы патыліцу не напякло. Ну вось, бадай, і ўсё.

А калі газета — на беларускай мове будзе? Дык то ўжо справа іншая! Тую газету, напэўна ж, схаваеш. Потым, калі знікне мова з ужытку, занясеш яе ў нейкі музей, атрымаеш вялікія грошы, як зараз за папірусы егіпецкія.

А калі раптам мова не згіне? Ну то і караблік, і капялюшык з гэткай газеты не горшы за іншыя зладзіцца.

Што дае табе падпіска на беларускамоўныя выданні?

Ты ўдасканальваешся ў роднай мове.

Ты пачуваеш сябе грамадзянінам сваёй краіны.

Ты ёсць носьбіт нацыянальнай культуры.

Ты падтрымліваеш беларускую прэсу.

Хіба не дастаткова?

Вось спіс беларускіх газетаў:

«Звязда», «Наша ніва», «Наша слова». Як бачыш — не густа. Дык падтрымай іх, каб не зніклі і гэтыя.

Асіповіцкая раённая арганізацыя грамадскага аб'яднання «Таварыства Беларускай мовы імя Францішка Скарыны».

Узначальвае яе заўсёдны падпісчык «Звязды» Сямён Дзмітрыевіч Барoдзіч.

А больш да гэтых слоў дадаць няма чаго. Хіба два радочкі з тлумачальнага слоўніка: «Жывая мова — мова якога-небудзь існуючага народа, якая ўжываецца як сродак зносін». «Мёртвая мова — старажытная мова, на якой ужо не гавораць».

Ёсць толькі міг... Між мінулым і будучым...

Далей — вы помніце.

**Валянціна ДОЎНАР.**

# Аматараў небяспечных феерверкаў чакаюць штрафы...

**У перадnavaгодні дні несанкцыянаванае выкарыстанне піратэхнікі становіцца актуальнай тэмай: штогод з-за выкарыстання няякасных петардаў людзі атрымліваюць траўмы і апёкі падчас такіх феерверкаў.**

Як адзначаюць у аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, за апошнія дні да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута больш за дваццаць незаконных гандляроў піратэхнічнай прадукцыяй, канфіскавана больш за 11 тысяч адзінак піратэхнікі. Паводле слоў намесніка міліцыі грамадскай бяспекі ГУУС палкоўніка міліцыі Рамана Мельніка, супрацоўнікі праваахоўных органаў могуць прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць «шэрых» гандляроў. Для гэтага міліцыя працуе сумесна з супрацоўнікамі падатковай міліцыі, і, як вынік, парушальнікі выплачваюць буйны штраф з канфіскацыяй прыбытку. У ГУУС таксама нагадваюць, што аматары выкарыстання піратэхнікі, асабліва ў грамадскіх месцах, могуць таксама быць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. Несанкцыянаванае выкарыстанне піратэхнікі прыраўноўваецца да дробнага хуліганства, і Адміністрацыйны кодэкс прадугледжвае адказнасць за такія правапарушэнні ад штрафу — 2—30 базавых велічынь — да адміністрацыйнага арышту тэрмінам да 15 сутак.

**Ігар ГРЫШЫН.**

**Падрабязнасці**

# Марыхуана ў... колах

**Больш за кілаграм марыхуаны было затрымана пры праўдзенні мытнага кантролю ў пункце пропуску «Брузгі».**

Паводле інфармацыі прэс-службы Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі, наркатычнае рэчыва знаходзілася ў коле, якое перавозіў у сваёй аўтамашыне дваццацігадовы грамадзянін Беларусі. Супрацоўнікаў Гродзенскай рэгіянальнай мытні насцярожыла, што кола не адпавядае гэтаму транспартнаму сродку. З дапамогай рэнтген-комплексу ў ім былі выяўлены пабочныя ўкладанні — у пустацелай прасторы знаходзіліся тры пакеты з рэчывам расліннага паходжання цёмна-зялёнага колеру, што ўказвала на марыхуану.

Затрыманы патлумачыў, што пра пабочныя ўкладанні нічога не ведае, а кола яго папрасіў прывезці за ўзнагароджанне знаёмы, жыхар Гродна. Акрамя таго, яшчэ адно кола было ўвезена раней, а два засталіся ў Польшчы і чакалі сваёй дастаўкі ў Беларусь.

У той жа дзень у раней увезеным коле выявілі яшчэ 1,2 кілаграма марыхуаны. А затым супрацоўнікі польскай мытнай службы па інфармацыі сваіх беларускіх калег знайшлі яшчэ два колы з пакетамі марыхуаны, а таксама з сотняй блокаў цыгарэт з расійскімі акцызнымі маркамі.

У выніку сумесных дзеянняў мытнікаў і супрацоўнікаў УКДБ па Гродзенскай вобласці затрыманы жыхар абласнога цэнтра, які з'яўляецца арганізатарам перавозкі наркотыкаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### «МІНЁР»

**На старыя граблі наступіў жыхар Баранавічаў, якога праваахоўнікі затрымалі за лжывае паведамленне аб небяспецы.**

Раней судзімы за аналагічнае злачынства 37-гадовы мужчына на гэты раз патэлефанаваў па «102» і праінфармаваў, што ў Свята-Пакроўскім саборы закладзена выбуховае прыстасаванне. Бомбу там не знайшлі, а вось «жартаўніка» вылічылі і затрымалі.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**

